У. А. Шынкарэнка, Н. А. Няпрахіна, В. Т. Цярошкіна

# ПРАЦОЎНАЕ НАВУЧАННЕ

## РАМЁСТВЫ



6 — 7
класы

У. А. Шынкарэнка, Н. А. Няпрахіна,
В. Т. Цярошкіна

# ПРАЦОЎНАЕ НАВУЧАННЕ

# РАМЁСТВЫ

Вучэбны дапаможнік для 6—7 класаў
першага аддзялення дапаможнай школы
з беларускай мовай навучання

*Дапушчана Міністэрствам адукацыі
Рэспублікі Беларусь*

Мінск
«Адукацыя і выхаванне»
2016

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

УДК 331-027.22(075.3=161.3)-056.313
ББК 74.3
Ш98

Пераклад з рускай мовы *С. В. Карпілавай*

Рэцэнзенты: кафедра «Тэхналогія і методыка выкладання» ўстановы адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт» (кандыдат тэхнічных навук, дацэнт, загадчык кафедры *С. Э. Завістоўскі*); настаўнік працоўнага навучання вышэйшай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі «Рудзенская дапаможная школа-інтэрнат для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў» *Л. В. Комлік*

## Умоўныя абазначэнні:

? — пытанні і заданні;

ПР — практычная работа;

П — практыкаванне

**Шынкарэнка, У. А.**

Ш98 Працоўнае навучанне. Рамёствы : вучэб. дапам. для 6—7-х кл. 1-га аддз-ня дапам. шк. з беларус. мовай навучання / У. А. Шынкарэнка, Н. А. Няпрахіна, В. Т. Цярошкіна ; пер. з рус. мовы С. В. Карпілавай. — Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2016. — 160 с. : іл.

ISBN 978-985-471-849-1.

**УДК 331-027.22(075.3=161.3)-056.313**
**ББК 74.3**

**ISBN 978-985-471-849-1**

© Шынкарэнка У. А., Няпрахіна Н. А., Цярошкіна В. Т., 2016
© С. В. Карпілава, пераклад на беларускую мову, 2016
© Афармленне. РУП «Выдавецтва “Адукацыя і выхаванне”», 2016

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Прадмова

Дарагі сябар!

У даўнейшыя часы адзенне, абутак, металічныя і іншыя неабходныя для жыцця вырабы ствараліся ручным спосабам, гэта значыць з дапамогай ручных прылад працы. Людзі, якія займаліся такой працай, называліся ***раменікамі***. Рамеснікаў шанавалі і паважалі за іх майстэрства.

Заняткі рамяством патрабуюць уменняў і спрыту, а іх здабыткі дапамагаюць людзям забяспечыць сваё жыццё. Аўтар аднаго з самых знакамітых слоўнікаў рускай мовы, пісьменнік і навуковец Уладзімір Іванавіч Даль вызначыў **рамяство** як «рукадзельнае майстэрства, ручная праца і ўменне, якім здабываюць хлеб».

У наш час многія людзі займаюцца рамяством, каб атрымліваць сродкі для жыцця. Можна сказаць, што для іх заняткі рамяством — гэта **промысел**. Але рамяством можна займацца і ў вольны ад асноўнай працы час, для таго каб атрымліваць ад гэтага задавальненне і ўпрыгожваць свой побыт. Напрыклад, вышываць для сябе або ў падарунак сурвэткі, плесці розныя прыгожыя вырабы з лазовых дубцоў.

Рамяство — гэта не толькі стварэнне новых вырабаў, але і выкананне рамонтных работ. Напрыклад, шавец займаецца як пашывам, так і рамонтам абутку.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У рамеснай працы звычайна карыстаюцца простымі інструментамі і прыстасаваннямі, якія прыдатныя не толькі для вытворчых, але і для практычных бытавых мэт.

Вывучаючы рамёствы, ты пазнаёмішся з іх гісторыяй і значэннем у сучасным жыцці чалавека, даведаешся пра матэрыялы, інструменты і прыстасаванні, неабходныя для заняткаў рамяством, навучышся ствараць цікавыя і патрэбныя для жыцця рэчы і выконваць практычныя работы.

Жадаем поспехаў у набыцці карысных ведаў і ўменняў.

*Аўтары*

**рамеснік, рамяство, промысел**



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# ПЛЯЦЕННЕ З ЛАЗОВАГА ДУБЦА

## 6 КЛАС

### § 1. Абсталяванне майстэрні

У спецыяльнай школьнай майстэрні ты будзеш вучыцца **пляценню з лазовага дубца.** У ёй ёсць класны ўчастак і ўчастак для выканання практычных работ. На **класным участку** размешчаны вучнёўскія сталы. Тут ты даведаешся пра матэрыялы для пляцення, інструменты, пазнаёмішся з вырабам і планам яго выканання.

На ўчастку для **практычных работ** ты будзеш вучыцца плесці рэчы з лазовага дубца. Тут абсталяваны працоўныя месцы. **Працоўнае месца пляцельшчыка** ўключае: стол з пластыкавым пакрыццём, крэсла, якое рэгулюецца па вышыні, набор інструментаў і прыстасаванняў для працы, станок для кручэння шаблона, кошык для абрэзкаў дубцоў (мал. 1).

Кожны вучань мае індывідуальны камплект інструментаў і працоўнай вопраткі. У майстэрні ёсць



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

месцы, спецыяльна адведзеныя для іх захоўвання.

Перад выкананнем практычнай работы табе абавязкова трэба апрануць працоўную вопратку. Гэта: фартух, нарукаўнікі, галаўны ўбор. Працоўная вопратка захавае цябе і тваю школьную форму ад забруджванняў і пашкоджанняў.



Мал. 1. Працоўнае месца пляцельшчыка

На працоўным месцы ў майстэрні важна захоўваць парадак. Пры выкананні практычных работ матэрыял павінен ляжаць толькі на рабочым стале. Для абрэзкаў дубцоў трэба карыстацца кошыкам, які размяшчаецца на падлозе злева ад пляцельшчыка. Пралітую ваду неабходна своечасова выціраць. Інакш раскіданыя на падлозе лазовыя дубцы і іх абрэзкі, разлітая вада могуць стварыць небяспеку.

У майстэрні на стэлажах размяшчаюцца ўзоры вырабаў з лазовага дубца і лепшыя работы навучэнцаў (мал. 2).



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 2. Стэлажы з вырабамі з лазовых дубцоў

1. Назаві ўчасткі майстэрні па пляценні з лазовага дубца.
2. Раскажы пра класны ўчастак.
3. Раскажы пра ўчастак для практычных работ.
4. Што ўключае ў сябе працоўнае месца пляцельшчыка?
5. Для чаго патрэбна працоўная вопратка? Пералічы, якое адзенне ты апранеш перад практычнай работай.
6. Раскажы пра захаванне парадку на працоўным месцы.

**пляценне з лазовага дубца, класны ўчастак, участак для практычных работ, працоўнае месца пляцельшчыка**



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## § 2. Правілы паводзін, бяспекі, санітарыі і гігіены на занятках па пляценні з лазовага дубца

На занятках у майстэрні па пляценні з лазовага дубца неабходна выконваць наступныя **правілы паводзін:**

• уваходзіць у майстэрню і выходзіць з яе толькі з дазволу настаўніка;

• не прыносіць у майстэрню рэчы, якія не маюць дачынення да ўрока;

• выконваць практычныя работы ў працоўнай вопратцы;

• прыбіраць сваё працоўнае месца пасля заканчэння працы;

• ведаць і строга выконваць правілы бяспекі, санітарыі і гігіены;

• паведамляць настаўніку пра выяўленыя няспраўнасці інструментаў і атрыманыя траўмы.

Працэс пляцення з лазовага дубца звязаны з выкарыстаннем рэжучых і колючых інструментаў. Працуючы з імі, неабходна выконваць **правілы бяспекі:**

• інструменты для працы рыхтаваць загадзя;

• выкарыстоўваць інструменты толькі па прызначэнні;

• карыстацца толькі спраўнымі інструментамі;

• працаваць на бяспечнай адлегласці адзін ад аднаго;

• размяшчаць інструменты вострымі і рэжучымі часткамі ад сябе;



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

• передаваць інструменты ручкамі ўперад;

• захоўваць інструменты ў адведзеных для гэтага месцах.

На занятках важна выконваць **правілы санітарыі і гігіены:**

• утрымліваць працоўную вопратку ў чысціні;

• падтрымліваць на працоўным месцы чысціню ў час працы;

• прыбіраць працоўнае месца па заканчэнні працы;

• прыводзіць у парадак інструменты і прыстасаванні пасля працы;

• мыць рукі з мылам пасля ўборкі працоўнага месца.

?

1. Назаві правілы паводзін у майстэрні. Чаму трэба іх выконваць?
2. Назаві правілы бяспекі. Для чаго яны неабходныя?
3. Пералічы правілы санітарыі і гігіены.

**правілы паводзін, правілы бяспекі, правілы санітарыі і гігіены**

## § 3. Пляценне з лазовага дубца як народны промысел і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва

**Рамяство** — гэта выраб прадметаў ручным спосабам з выкарыстаннем простых прылад працы. Да рамёстваў належыць і пляценне з лазовага дубца. Гэтае



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

народнае ўмельства бярэ пачатак з сельскага побыту. Сельскія жыхары плялі неабходныя для іх жыцця рэчы — кошыкі для збору і захоўвання ўраджаю, дзіцячыя калыскі, загарадзі (платы) і іншыя бытавыя вырабы.



Мал. 3. «Кошык беларускі»

Да нашых дзён захавалася і выкарыстоўваецца тэхналогія вырабу кошыка, які плялі нашы продкі, што жылі на тэрыторыі сучаснай Рэспублікі Беларусь. Гэты кошык называецца «беларускі» (мал. 3).

Плецены вырабы заўсёды карысталіся попытам у насельніцтва. Майстры плялі рэчы на продаж. Рамяство развівалася, ствараліся арцелі і невялікія фабрыкі па вытворчасці вырабаў з тонкіх і гнуткіх дубцоў вярбы і іншых хмызняковых і драўнінных раслін. Гэтыя вырабы і сёння працягваюць плесці не толькі для практычнага выкарыстання, але і для ўпрыгожвання жытла чалавека.

Майстры па пляценні навучыліся рабіць розныя вазы, кашпо, насценныя пано, сувенірныя кошычкі для кветак, прыгожыя хлебніцы і плеценую мэблю. Гэтыя работы можна ўбачыць на выставах, кірмашах, у крамах (гл. мал. 2).

Найбольш прыгожыя і рэдкія работы майстроў з'яўляюцца творамі **дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.** Яны маюць мастацкую каштоўнасць (мал. 4).



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 4. Плеценыя вырабы — творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва

1. Што такое рамяство?
2. Чаму пляценне з лазовага дубца можна назваць народным промыслам?
3. Раскажы пра выкарыстанне плеценых вырабаў.

**рамяство, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва**

## § 4. Матэрыялазнаўства

Для выканання плеценых вырабаў выкарыстоўваюць **натуральныя (прыродныя)** і штучныя матэрыялы.

Адным з самых каштоўных натуральных матэрыялаў з'яўляецца дубец з вярбы — **лазовы дубец.** У прыродных умовах лазняк расце па пясчаных берагах вадаёмаў. Пры спрыяльных умовах ён хутка разрастаецца, утвараючы зараснікі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

На тэрыторыі нашай рэспублікі расце некалькі відаў вербалозу, дубец якога прыдатны для пляцення. Вось некаторыя з іх.

**Вярба пурпурная** — густы галіністы лазняк вышынёй ад 2 да 5 м. Кара яго пурпурна-чырвоная, часам з шэрым налётам. Знутры кара лімонна-жоўтая. Парасткі тонкія, гнуткія, з рэдкім лісцем. Пупышкі на галінах дробныя, прыціснутыя да парастка. Вярба лёгка размножваецца чаранкамі. Пурпурная вярба святлалюбная, дрэнна пераносіць затапленне паводкавымі водамі. Працягласць жыцця — да 30 гадоў (мал. 5).



Мал. 5. Вярба пурпурная

**Вярба трохтычынкавая** — лазняк вышынёй 6—7 м. Парасткі жаўтавата-зялёнага колеру, тонкія, гнуткія. Лісце зверху — цёмна-зялёнае, матавае, а знізу — светла-зялёнае ці шэрае. Даўжыня лісточка 4—15 см. Кара багатая на **дубільныя рэчывы,** якія надаюць дубцу карычневае адценне. Лаза гэтай вярбы высокай якасці — гнуткая і трывалая, прыдатная для пляцення. Яна добра колецца і стругаецца на стужкі (мал. 6).



Мал. 6. Вярба трохтычынкавая



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Якасны лазовы дубец павінен мець наступныя знешнія прыметы:

- быць доўгім (чым даўжэйшы, тым лепш);
- мець спелую драўніну;
- быць без бакавых галінак і дэфектаў кары;
- мець малую збежнасць.

**Збежнасць** — гэта розніца ў таўшчыні паміж **камлём** (пачаткам дубца) і яго вяршыняй.

Да натуральных матэрыялаў, якія часта выкарыстоўваюцца ў пляценні, таксама належыць **стужка-глянец.** Яе вырабляюць з лазовых дубцоў. Плеценыя са стужкі-глянец вырабы атрымліваюцца па вазе больш лёгкія, але менш трывалыя, чым з цэлага дубца.

Плесці вырабы можна і са штучных матэрыялаў. Гэта каляровыя дрот і шнур, пластыкавыя стужкі і інш. На гэтых матэрыялах зручна вучыцца прыёмам пляцення, паколькі яны маюць вялікую даўжыню, яркі колер, не ламаюцца (мал. 7).



Мал. 7. Штучныя матэрыялы

1. Якія матэрыялы выкарыстоўваюць для атрымання плеценых вырабаў?
2. Назаві натуральныя матэрыялы. Які з іх самы каштоўны?
3. Назаві віды вербаў і іх знешнія прыметы.
4. Пералічы знешнія прыметы якаснага лазовага дубца.
5. Назаві штучныя матэрыялы. Для чаго іх выкарыстоўваюць?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Матэрыялы: натуральныя (прыродныя), штучныя, лазовы дубец; вербы: пурпурная, трохтычынкавая; дубільныя рэчывы, збежнасць, камель, стужка-глянец**

ПР Вызначэнне відаў вярбы.

Ход працы

1. Знайдзі вербы сярод іншых дрэў і хмызнякоў.
2. Знайдзі вярбу пурпурную па знешніх прыметах.
3. Знайдзі вярбу трохтычынкавую па знешніх прыметах.
4. Знайдзі дубцы, прыдатныя для пляцення.

## § 5. Нарыхтоўка лазовых дубцоў

Перш чым прыступіць да пляцення вырабаў, неабходна навучыцца правільна нарыхтоўваць лазовы дубец.

Ты ўжо ведаеш, што вярба — расліна вільгацелюбівая. Вербалоз часцей за ўсё расце па берагах вадаёмаў. З-за дажджоў, раставання снегу, разліву рэк месцы вырастання вярбы бываюць вільготнымі або падтопленымі вадой. Табе трэба быць гатовым да гэтага. На нарыхтоўку варта абуць зручны непрамакальны абутак, апрануць куртку і галаўны ўбор у адпаведнасці з надвор'ем. З сабой трэба мець пальчаткі, прылады для зрэзкі дубцоў, вяроўку для іх звязвання.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Лепшыя для нарыхтоўкі — **аднагадовыя прыкаранёвыя парасткі.** Гэта дубцы, якія растуць ад кораня расліны. Можна таксама выкарыстаць **аднагадовы прырост галін — бакавыя** галіны (мал. 8).




Мал. 8. Дубцы для нарыхтоўкі: *а* — прыкаранёвыя парасткі; *б* — аднагадовы прырост галін

Заўсёды памятай, што з няякаснага матэрыялу немагчыма сплесці добры выраб. Якасныя лазовыя дубцы павінны быць аднолькавымі па таўшчыні і даўжыні, без сучкоў, бакавых галінак, дэфектаў кары.

Лазовыя дубцы можна нарыхтоўваць амаль увесь год — увосень, зімой і вясной. Улетку лазовыя дубцы не нарыхтоўваюць — яны ў гэты час травяністыя і недастаткова трывалыя. Толькі да восені драўніна дубцоў выспявае. Лаза набывае патрэбныя для пляцення ўласцівасці: **пругкасць, гнуткасць, трываласць** (мал. 9).




Мал. 9. Зрэзы лазовых дубцоў: *а* — летам; *б* — восенню

Восеньская нарыхтоўка адрозніваецца ад зімовай і вясновай тым, што на дубцах яшчэ ёсць лісце. Дубцы ачышчаюць ад лісця на месцы нарыхтоўкі



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

лазы. Адной рукой трымаюць дубец за вяршыню, другой — адным рухам ад вяршыні да камля счышчаюць лісце.

Зімовую нарыхтоўку лазы ўскладняюць суровыя ўмовы надвор'я: моцны мароз, глыбокі снег. Вясновая нарыхтоўка доўжыцца да перыяду пачатку руху соку і распускання пупышак на лазовых дубцах.

Для нарыхтоўкі лазовых дубцоў выкарыстоўваюць ручныя інструменты: **сякатар, бакарэз, нож**. Усе гэтыя інструменты з'яўляюцца рэжучымі. Яны маюць ручкі і рабочую рэжучую частку (мал. 10).

Сякатар служыць для нарыхтоўкі тоўстых парасткаў. Добры сякатар з лёгкасцю перасякае дубцы таўшчынёй да 10—12 мм у дыяметры. Сякатар складаецца з рэжучай часткі, дзвюх ручак, спружыны і фіксатара. Сякатар можа знаходзіцца ў двух становішчах — у рабочым і нерабочым. Калі інструмент знаходзіцца ў **рабочым становішчы**, фіксатар апушчаны,




Мал. 10. Інструменты для нарыхтоўкі лазы:
*а* — сякатар; *б* — бакарэз; *в* — нож



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

а ручкі разведзены. У **нерабочым** становішчы сякатара фіксатар падняты ўверх, ручкі і рэжучая частка самкнёныя і нерухомыя.

Бакарэз выкарыстоўваюць толькі для нарыхтоўкі тонкіх дубцоў. Прынцып яго работы падобны з сякатарам. Бакарэз яшчэ называюць **кусачкамі,** паколькі ён не адразае дубец, а «адкусвае».



Мал. 11. Нарыхтоўка лазовых дубцоў

Для нарыхтоўкі лазы можна карыстацца спецыяльным нажом з загнутым лязом. Але гэты інструмент у рабоце найбольш небяспечны. Памятай, што з рэжучымі інструментамі трэба абыходзіцца акуратна, каб не параніць сябе і таварышаў.

Пры нарыхтоўцы лазовых дубцоў важна выконваць наступныя **правілы.** Левай рукой выбіраюць, адгінаюць і прытрымліваюць дубец. У правай руцэ трымаюць інструмент, з дапамогай якога дубец зразаюць (мал. 11).

Зразаць дубец трэба каля асновы, пакідаючы пянёк вышынёй 2—4 см. У гэтым месцы ў наступным годзе ўтворацца новыя парасткі (мал. 12).



Мал. 12. Утварэнне парасткаў каля зрэзу



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Зрэз павінен быць гладкім, без задзіраў кары і адшчэпаў драўніны.

Зрэзаныя дубцы складаюць у пучкі. Звязваюць пучкі вяроўкай каля камлёў і вяршыняў (мал. 13). У такім выглядзе лазу зручна пераносіць або перавозіць у транспарце.



Мал. 13.
Падрыхтоўка лазы да транспарціроўкі

?

1. Дзе нарыхтоўваюць лазовы дубец?
2. Што неабходна ўзяць з сабой на нарыхтоўку лазовых дубцоў?
3. Якія дубцы прыдатныя для нарыхтоўкі?
4. Якімі павінны быць якасныя лазовыя дубцы?
5. У якую пару года лазовыя дубцы не нарыхтоўваюць? Чаму?
6. Назаві ўласцівасці, якія набываюць лазовыя дубцы да восені.
7. Раскажы пра асаблівасці нарыхтоўкі лазовых дубцоў у розныя поры года.
8. Якія інструменты выкарыстоўваюць для нарыхтоўкі лазы (гл. форзац 1)?
9. Навошта пры зрэзцы дубца пакідаюць невялікі пянёк?
10. Як падрыхтаваць зрэзаныя дубцы да транспарціроўкі?

**аднагадовыя прыкаранёвыя парасткі, аднагадовы прырост галін; пругкасць, гнуткасць, трываласць; сякатар, бакарэз, нож**



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Патрабаванні бяспекі
## пры нарыхтоўцы лазовых дубцоў

**Магчымыя небяспекі:**

- вострыя вяршыні дубцоў;
- рэжучыя інструменты;
- праца паблізу ад вадаёма;
- транспарціроўка лазы.

**Патрабаванні бяспекі да пачатку выканання задання:**

- апрануць спецвопратку;
- праверыць спраўнасць інструментаў.

**Патрабаванні бяспекі ў час выканання задання:**

- перамяшчацца і працаваць на бяспечнай адлегласці адзін ад аднаго;
- не падыходзіць блізка да вадаёма;
- аберагаць вочы ад вострых вяршыняў дубцоў;
- ахоўваць рукі ад рэжучых інструментаў;
- выкарыстоўваць інструменты толькі па прызначэнні;
- пры атрыманні траўмы неадкладна звярнуцца да настаўніка.

**Патрабаванні бяспекі па заканчэнні выканання задання:**

- ачысціць інструменты, здаць настаўніку;
- звязаць у пучкі нарыхтаваныя дубцы;
- пры транспарціроўцы трымаць дубцы на бяспечнай адлегласці ад сябе;



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

• выконваць правілы паводзін пры транспарціроўцы лазы ў грамадскім транспарце;

• здаць нарыхтаваную лазу для захоўвання на склад.

ПР Нарэзка дубцоў для пляцення.

Ход працы

1. Ачысці дубцы ад лісця.

2. Адсартуй дубцы без бакавых галінак, сучкоў, дэфектаў кары.

3. Складзі дубцы ў пучкі. Звяжы пучкі.

## § 6. Сартаванне лазовых дубцоў

**Сартаванне** — гэта выбар чаго-небудзь па пэўных прыметах. **Неакаркаваныя** (з карой) лазовыя дубцы сартуюць па трох прыметах: колер, таўшчыня, даўжыня. Сартуюць лазу для таго, каб было лягчэй падбіраць дубцы, патрэбныя для пляцення вырабаў.

**Колер** дубцоў з карой залежыць ад віду вярбы. Часцей за ўсё дубцы бываюць жаўтавата-зялёнага колеру (у трохтычынкавай вярбы) і пурпурна-чырвонага з шэрым налётам (у пурпурнай вярбы).

Для сартавання лазы **па таўшчыні** выкарыстоўваюць простае **прыстасаванне** (мал. 14). Гэта драўляны брусок, у якім прасвідраваны адтуліны




Мал. 14. Прыстасаванне для сартавання лазы па таўшчыні



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

markdown
рознага дыяметра — ад 2 да 6—8 мм і больш. Памер адтуліны пазначаны лічбай.

Камлёвую частку дубца ўстаўляюць у адтуліну, падбіраючы самую меншую, у якую ўваходзіць дубец. Пры сартаванні дубцы раскладваюць на рабочым стале ў адпаведнасці з лічбамі на прыстасаванні. Злева раскладваюць самыя тонкія, з правага боку — больш тоўстыя.

**Па даўжыні** дубцы сартуюць пры дапамозе метровай лінейкі, вертыкальна прымацаванай да ёмістасці (мал. 15). Па даўжыні дубцы сартуюць на кароткія (да 50 см), сярэднія (да 100 см) і доўгія (даўжэйшыя за 100 см). Пучкі лазовых дубцоў, папярэдне развязаныя, ставяць камлямі ў ёмістасць. Першымі з ёмістасці дастаюць самыя доўгія дубцы (вышэйшыя за мерную лінейку), потым сярэднія і кароткія.



Мал. 15. Прыстасаванне для сартавання лазы па даўжыні

Пры сартаванні трэба знаходзіцца на бяспечнай адлегласці адзін ад аднаго і берагчы вочы ад траўмы вяршынямі лазовых дубцоў.

Неакаркаваныя дубцы захоўваць доўга складана, таму што яны маюць уласцівасць высыхаць. Каб захаваць дубцы вільготнымі і гнуткімі, можна ненадоўга (на 7—10 дзён) паставіць пучкі з лазой у ёмістасць з вадой, апусціўшы ў ваду толькі камлі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Што такое сартаванне? Для чаго сартуюць лазу?
2. Назаві прыметы, па якіх сартуюць неакаркаваныя лазовыя дубцы.
3. Ад чаго залежыць колер кары лазовых дубцоў? Якога колеру бываюць дубцы?
4. Пры дапамозе чаго сартуюць дубцы па таўшчыні?
5. Як сартуюць дубцы па таўшчыні пры дапамозе прыстасавання?
6. Раскажы, як сартуюць дубцы па даўжыні.
7. На якой адлегласці адзін ад аднаго трэба працаваць пры сартаванні лазы? Чаму?
8. Раскажы пра захоўванне неакаркаваных лазовых дубцоў.

**сартаванне, прыстасаванне для сартавання дубцоў па таўшчыні, неакаркаваны лазовы дубец**

ПР Сартаванне неакаркаваных дубцоў.

Ход працы

1. Адсартуй неакаркаваныя дубцы па колеры.
2. Адсартуй неакаркаваныя дубцы па таўшчыні.
3. Адсартуй неакаркаваныя дубцы па даўжыні.

## § 7. Інструменты і трэнажоры для пляцення

Асноўнымі інструментамі для пляцення вырабаў з лазы з’яўляюцца: бакарэз (кусачкі), нож-касяк, шыла, круглагубцы.

**Бакарэз** (кусачкі) выкарыстоўваецца для нарэзкі дубцоў на стойкі, абрэзкі канцоў дубцоў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

З гэтым інструментам ты ўжо пазнаёміўся раней (гл. мал. 10).

**Нож-касяк** прызначаны для завострывання дубцоў і гладкай абрэзкі іх канцоў. У яго ёсць зручная ручка і кароткае, зрэзанае на вугал лязо. Трэба вучыцца рабіць зрэз нажом адным рухам, спосабам «ад сябе».

**Шылам** павялічваюць адтуліны для дубцоў, выраўноўваюць стойкі, ушчыльняюць пляценне. Шыла для пляцення патрэбна выгнутае і злёгку прытупленае. У час працы шыла заўсёды павінна быць накіравана ад чалавека ў бок рабочай паверхні стала або вырабу.

**Круглагубцы** — інструмент, з дапамогай якога размінаюць дубцы ў месцах згінання (мал. 16).

Вывучаць прыёмы пляцення і авалодваць імі ты будзеш на трэнажорах. **Трэнажор** — гэта прыстасаванне для навучання прыёмам пляцення. Трэнажоры




Мал. 16. Інструменты для пляцення вырабаў:
*а* — нож-касяк; *б* — шыла; *в* — круглагубцы



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

бываюць прамыя, круглыя, тарцовыя (мал. 17).

**Прамы трэнажор** — гэта драўляны брусок, у якім прасвідраваны адтуліны дыяметрам 5—6 мм. На прамых трэнажорах вучацца выконваць простыя прыёмы пляцення.

**Круглы трэнажор** уяўляе сабой драўляны дыск, у якім па крузе прасвідраваны адтуліны. На круглых трэнажорах асвойваюць прыёмы пляцення па крузе.

На **тарцовым трэнажоры** адтуліны прасвідраваны па акружнасці дыска па канцы. На такім трэнажоры ты будзеш вучыцца плесці некаторыя загібкі.

Прамы і круглы трэнажоры маюць адтуліны, прасвідраваныя навылет. У іх вертыкальна ўстаўляюцца дубцы — **стойкі.** Яны служаць асновай для пляцення.

*а*



*б*



*в*



Мал. 17. Трэнажоры для пляцення:
*а* — прамы;
*б* — круглы;
*в* — тарцовы

1. Якія ты ведаеш асноўныя прылады для пляцення вырабаў з лазы?
2. Для чаго выкарыстоўваюць бакарэз, нож-касяк, шыла, круглагубцы?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

3. Што такое трэнажор? Для чаго карыстаюцца трэнажорамі?
4. Якія бываюць трэнажоры? Раскажы пра кожны з іх.
5. Для чаго ў трэнажорах прасвідраваны адтуліны?

**бакарэз (кусачкі), нож-касяк, шыла, круглагубцы, трэнажоры: прамыя, круглыя, тарцовыя; стойкі**

ПР Наразанне бакарэзам стоек для трэнажора па памеры, зададзеным настаўнікам.

## § 8. Падрыхтоўка матэрыялу да пляцення

Вільготныя лазовыя дубцы гнуткія і пругкія. Гэтыя якасці для пляцення вельмі важныя. Але ў вільготным стане дубцы доўга захоўвацца не могуць. У цёплым памяшканні, якое добра праветрываецца, яны высыхаюць і змяняюць свае ўласцівасці: робяцца ломкімі, губляюць гнуткасць і пругкасць. З сухога матэрыялу плесці немагчыма. Таму спачатку лазовыя дубцы трэба размачыць.

Для замочвання дубцоў у майстэрні знаходзяцца ёмістасці з вадой. Памер ёмістасці выбіраюць у залежнасці ад колькасці матэрыялу, які трэба падрыхтаваць да працы. Галоўная ўмова пры замочванні дубцоў — каб увесь матэрыял быў пакрыты вадой. Сухія дубцы ў вадзе не тонуць, таму іх лепш прыціснуць грузам да дна ёмістасці.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Ваду ў ёмістасці заліваць лепш пакаёвай тэмпературы ці крыху цяплейшую. Навобмацак яна будзе халоднай. Пры такіх умовах акаркаваныя дубцы не зменяць свой колер, але размочвацца яны будуць даўжэй, чым у цёплай вадзе. У цёплай вадзе лаза робіцца больш цёмнай, змяняе свой натуральны малочна-белы або бэжавы колер на карычневы.

Працягласць размочвання лазы залежыць ад таўшчыні дубцоў. Тонкія дубцы будуць гатовыя для пляцення прыкладна праз 10—15 хвілін, тоўстыя трэба размочваць не менш за 20—30 хвілін. Па заканчэнні размочвання дубцы можна праверыць на гнуткасць. Трэба накруціць дубец на круглы шаблон або сагнуць яго каля камля. Добра размочаны дубец не ламаецца.

Пры замочванні лазы трэба выконваць наступныя **правілы бяспекі працы**:

- своечасова прыбіраць пралітую на падлогу ваду;
- не наліваць у ёмістасці вельмі гарачую ваду.

Каб лепш вызначыць уласцівасці вільготных лазовых дубцоў і стужкі-глянец, можна сплесці з гэтых матэрыялаў просты і вельмі прыгожы выраб, падобны на дэкаратыўную кветку на ножцы (мал. 18).



Мал. 18. Кветкі са стужкі-глянец



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

З такіх «кветак» можна скласці букет ці цэлую кампазіцыю, якая ўпрыгожыць любое памяшканне.

?

1. Якія якасці ў вільготных лазовых дубцоў, сухіх дубцоў?
2. Раскажы, як трэба замочваць лазу.
3. Якія правілы бяспекі працы трэба выконваць пры замочванні лазы?
4. Як даведацца, што лазовы дубец падрыхтаваны да працы?

П

1. Замачы лазовыя дубцы.
2. Вызначы іх гатоўнасць да працы.

ПР

Выраб дэкаратыўных кветак шляхам накручвання тонкіх доўгіх дубцоў або стужкі-глянец на шаблон (цыліндр даўжынёй 20 см, дыяметрам 1—2 см).

Ход працы

1. Прымацуй вяршыню дубца мяккім дротам да шаблона.
2. Накруці палову даўжыні дубца (стужкі) на шаблон.
3. Выраўнуй ножку ўздоўж шаблона, замацуй дротам.
4. Дай дубцу высахнуць, здымі кветку з шаблона.

## § 9. Простае пляценне

**Простае пляценне** — гэта адзін з відаў **суцэльнага** (шчыльнага) **пляцення.** Выкарыстоўваецца простае пляценне для вырабу сценак і донцаў бытавых



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

кошыкаў, плоту (загарадзі), беларускіх кошыкаў і іншых рэчаў (мал. 19).



Мал. 19. Простае пляценне

Аснова любога плеценага вырабу — стойкі. У вырабе яны размешчаны вертыкальна. Стойкі заўсёды павінны быць таўсцейшымі за дубцы, якімі будуць плесці. Простым спосабам плятуць, абгінаючы адну стойку з добрага (правага) боку, другую стойку — з вываратнага (левага) боку. Такім спосабам рухаюцца ў правы бок.

Калі пры пляценні лазовы дубец заканчваецца, да яго падстаўляюць (нарошчваюць) наступны. Камлі дубцоў накладваюць адзін на адзін накрыж за стойкай. Вяршыні таксама накладваюць адна на адну і праплятаюць на працягу трох-чатырох стоек. Канцы дубцоў абразаюць кусачкамі або нажом (мал. 20).



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

*а*



*б*



Мал. 20. «Нарошчванне» дубцоў:
*а* — злучэнне вяршынямі; *б* — злучэнне камлямі

Простае пляценне на круглым трэнажоры ўяўляе сабой бесперапынны рад, які ідзе па спіралі ўверх у шахматным парадку. У першым радзе абгінаем з добрага боку 1-ю і ўсе астатнія няцотныя стойкі, у другім радзе — 2-ю і ўсе цотныя стойкі. Для выканання простага пляцення на круглым трэнажоры бяруць няцотную колькасць стоек.

Пляценне павінна быць **шчыльнае.** Яго ўшчыльняюць, націскаючы пальцамі на кожны рад так, каб паміж радамі не было прарэхаў. Трэба сачыць за тым, каб стойкі пры пляценні размяшчаліся вертыкальна і не нахіляліся ў бакі. Адлегласць паміж стойкамі вытрымліваецца аднолькавай.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Дзе выкарыстоўваецца простае пляценне?
2. Для чаго ў пляценні патрэбныя стойкі?
3. Раскажы пра паслядоўнасць выканання простага пляцення.
4. Як можна «нарасціць» дубцы пры пляценні?
5. Якія патрабаванні да якасці простага пляцення ты ведаеш?

**простае пляценне, суцэльнае пляценне, добры (правы) бок, вываратны (левы) бок, пляценне шчыльнае**

1. Вызначы віды пляцення на ўзорах вырабаў.
2. Выканай простае пляценне на прамым трэнажоры.
3. Выканай простае пляценне на круглым трэнажоры.

## § 10. Вяровачка ў два дубцы

**Спосаб пляцення** «вяровачка» называюць так таму, што ў працэсе пляцення дубцы пераплятаюцца паміж сабой, нібы скручваюцца, звіваюцца як валокны вяроўкі. Вяровачкі бываюць у два, тры, чатыры дубцы. Усе віды вяровачак плятуць для трываласці вырабу з лазы і для яго прыгажосці.

**Вяровачка ў два дубцы** знешне падобная на простае пляценне. Яе цяжка вылучыць у плеценым вырабе. Ва ўсіх вяровачках дубцы перакручаны паміж сабой. Пацягнуўшы за адзін дубец, вяровачку не расплящеш, а простае пляценне расплятаецца лёгка.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

*Паслядоўнасць пляцення вяровачкі ў два дубцы*

1. Дубцы *А* і *Б* закласці за стойкі *1* і *2* (мал. 21).

2. Дубчыкам *А* абвесці стойку *2* з добрага боку, а стойку *3* — з вываратнага боку і вывесці дубец на добры бок паміж стойкамі *3* і *4*.

3. Дубчыкам *Б* абагнуць з добрага боку стойку *3*, а з вываратнага боку — стойку *4* і вывесці на добры бок паміж стойкамі *4* і *5*. Дубцамі плесці па чарзе. У такім парадку прадаўжаць плесці да таго часу, пакуль не замкнецца кола.




Мал. 21. Пачатак пляцення вяровачкі ў два дубцы

Пляценне атрымліваецца прыгожым, калі акуратна выканаць падстаноўку дубцоў (мал. 22).

*Паслядоўнасць падстаноўкі новага дубца*

1. Адхіліць налева дубец, які скончыўся.

2. Уставіць новы дубец побач з ім справа.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

3. Абагнуць новым дубцом стойку звонку, а наступную знутры, вывесці яго наверх.

4. Падстаўіць другі дубец, як і першы.

5. Абрэзаць канцы дубцоў, якія скончыліся.



Мал. 22. Злучэнне дубцоў (выгляд зверху)

Пры гэтым спосабе злучэння дубцоў пляценне атрымліваецца акуратным, паколькі месца злучэння амаль непрыкметнае.

1. Чаму спосаб пляцення «вяровачка» так называецца?
2. Для чаго ў вырабах плятуць вяровачкі?
3. Раскажы пра паслядоўнасць пляцення вяровачкі ў два дубцы.
4. Раскажы пра паслядоўнасць злучэння дубцоў пры пляценні вяровачкі ў два дубцы.

**спосаб пляцення «вяровачка», вяровачка ў два дубцы**

П 1. Знайдзі вяровачку ў два дубцы на ўзорах вырабаў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

2. Выканай вяровачку ў два дубцы дротам рознага колеру на прамым трэнажоры.
3. Выканай вяровачку ў два дубцы на круглым трэнажоры.
4. Выканай чаргаванне пляцення вяровачкі ў два дубцы і простага пляцення.

## § 11. Простая загібка

**Загібка** — гэта элемент, якім заканчваецца пляценне сценкі вырабу. Загібка завяршае выраб і надае яму трываласць і жорсткасць (мал. 23).



Мал. 23. Кант вырабу з простай загібкай

Выплятаюць загібкі са свабодных канцоў стоек або з падстаўленых дубцоў. Усё залежыць ад віду і складанасці загібкі. Адной з самых лёгкіх у выкананні з'яўляецца **простая загібка.** Яе выкарыстоўваюць для пляцення вырабаў бытавога прызначэння.

*Паслядоўнасць пляцення простай загібкі за адну стойку*

1. Падкласці палачку справа каля першай стойкі.
2. Сагнуць першую стойку на палачку направа (мал. 24).



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

3. Аплесці другую стойку з добрага боку і пакінуць дубец з вываратнага боку (унутры вырабу).

4. Абрэзаць дубец з вываратнага боку за трэцяй стойкай (мал. 25).



Мал. 24. Пачатак пляцення простай загібкі



Мал. 25. Завяршэнне пляцення простай загібкі

Другую і наступныя стойкі праплятаем аналагічна, але без дадатковай падстаноўкі палачкі. Апошнюю стойку ў круглым вырабе запраўляем у адтуліну замест дадатковай палачкі і абразаем за другой сагнутай стойкай.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

*Паслядоўнасць пляцення простай загібкі за дзве стойкі*



Мал. 26. Пачатак пляцення простай загібкі за дзве стойкі

1. Падкласці палачкі справа каля першай і другой стоек.

2. Сагнуць першую стойку на палачку направа (мал. 26).

3. Аплесці дзве стойкі (другую і трэцюю) з добрага боку і пакінуць дубец унутры вырабу (з вываратнага боку).

4. Абрэзаць дубец з вываратнага боку за чацвёртай стойкай.

Наступныя стойкі праплятаем аналагічна. Апошнія стойкі ў вырабе запраўляем па чарзе ў адтуліны замест дадатковых палачак і абразаем унутры вырабу за стойкамі.

*Патрабаванні да якасці простай загібкі:*

- па ўсёй даўжыні няма надламаных дубцоў;
- канцы дубцоў укладзены і абрэзаны правільна;
- кант роўны, мае аднолькавую вышыню.

Перад пляценнем загібкі, каб не ламаліся стойкі, трэба вельмі добра іх размачыць. Калі пры пляценні стойка ўсё ж зламалася, яе можна замяніць на іншую. Для гэтага зламаную стойку зразаюць, не пакідаючы пянька. Кончык шыла ўстаўляюць зверху ў пляценне, з левага боку ад зрэзанай стойкі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Запасны, добра размочаны дубец падоўжна вострацць з боку камля і ўстаўляюць у адтуліну замест шыла. Новым дубцом пры згінанні направа закрываюць месца зрэзу стойкі. Вострацць дубцы для таго, каб яны лёгка ўстаўляліся ў адтуліну, не разбураючы і не драпаючы пляценне.

**Падоўжны зрэз** на камлі тонкага (3—4 мм у дыяметры) дубца робяць наўскасяк адным рухам нажа спосабам «ад сябе». Тоўстыя дубцы (5 мм і больш у дыяметры) вострацць з трох бакоў. Адзін бок не зразаюць, пакідаюць некранутым (мал. 27).



Мал. 27. Падоўжны зрэз:
*а* — на тонкіх дубцах;
*б* — на тоўстых дубцах

Устаўляюць завостраны дубец зрэзам на вываратны бок вырабу, гладкім, нязрэзаным бокам — на добры бок.

1. Што такое загібка?
2. Для чаго ў вырабах плятуць загібкі?
3. У якіх вырабах плятуць простую загібку?
4. Раскажы пра паслядоўнасць пляцення простай загібкі за адну стойку, за дзве стойкі.
5. Якія патрабаванні да якасці простай загібкі?
6. Раскажы, як памяняць стойку, калі яна зламалася.
7. Што такое падоўжны зрэз? Як яго зрабіць на тонкіх дубцах, на тоўстых?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**загібка, простая загібка, падоўжны зрэз**

П

1. Знайдзі загібкі на ўзорах вырабаў.
2. Выканай простыя загібкі за адну стойку на трэнажоры.
3. Выканай простыя загібкі за дзве стойкі на трэнажоры.
4. Завастры тонкія (тоўстыя) дубцы на падоўжны зрэз.

## § 12. Выраб кашпо для кветкавага вазона

**Кашпо** — гэта дэкаратыўная ёмістасць для кветкавага вазона. Выкарыстоўваюць кашпо ў тых выпадках, калі вазон для кветак мае не той колер або знешні выгляд, які патрэбен для інтэр'еру. Правільна падабраныя кашпо робяць памяшканне больш утульным і прыгожым (мал. 28).





Мал. 28. Кашпо з кветкавымі вазонамі



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Кашпо бывае з дном і без дна. Па памеры яно павінна быць крыху большым за вазон. Плятуць кашпо на шаблоне. **Шаблон** — гэта прыстасаванне для надання вырабу патрэбнай формы.

Шаблоны бываюць рознай формы і канструкцыі. Форма шаблона залежыць ад формы патрэбнага вырабу. Форму аплятаюць дубцамі і дастаюць яе з вырабу, калі праца скончана.

Самы просты шаблон складаецца з наступных дэталяў (мал. 29):

• форма (пластыкавая або драўляная);



Мал. 29. Шаблон для пляцення кашпо



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

• аснова з адтулінамі для стоек;

• дэталі мацавання (стрыжань з разьбой, шрубы: верхняя і ніжняя).

Перад працай шаблон трэба сабраць і ўсталяваць на станок так, каб ён лёгка круціўся.

*Паслядоўнасць пляцення кашпо без дна*

1. Скамплектаваць і замачыць матэрыял.
2. Уставіць стойкі ў шаблон.
3. Замацаваць стойкі вяровачкай у два дубцы (тры рады).
4. Выплесці сценку кашпо простым спосабам.
5. Праплесці вяровачкай у два дубцы тры рады.
6. Зрабіць простую загібку праз дзве за адну стойку.
7. Зняць выраб з шаблона.
8. Абрэзаць ніжнія стойкі.

*Патрабаванні да якасці кашпо:*

• стойкі размешчаны вертыкальна і на аднолькавай адлегласці адна ад адной;

• пляценне і падстаноўка дубцоў і стужкі выкананы правільнымі спосабамі;

• загібка роўная, без надлому дубцоў;

• усе дубцы абрэзаны акуратна.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Што такое кашпо?
2. У якіх выпадках выкарыстоўваюць кашпо?
3. Для чаго ў пляценні выкарыстоўваюць шаблон?
4. Назаві дэталі шаблона.
5. Раскажы пра паслядоўнасць вырабу кашпо.
6. Назаві патрабаванні да якасці кашпо.

**кашпо, шаблон**

ПР Пляценне кашпо.

Ход працы

1. Збяры шаблон для кашпо.
2. Падбяры і замачы матэрыял.
3. Спляці кашпо.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# 7 КЛАС

## § 13. Акаркаванне лазовых дубцоў

**Акаркаванне** — гэта ачышчэнне лазовых дубцоў ад кары. Акаркаванне дубца можна правесці ў тыя ж тэрміны, што і нарыхтоўку. Існуюць некалькі спосабаў падрыхтоўкі лазовых дубцоў да акаркавання. Адзін з іх — праварванне. На праваранных дубцах кара лёгка адстае ад драўніны.

Нарыхтаваны лазовы дубец кладуць у ёмістасць, прыціскаюць грузам і заліваюць вадой так, каб дубцы былі пакрыты цалкам, закрываюць ёмістасць накрыўкай. Праварванне праводзіцца ў кіпні на працягу 30—60 хвілін. Пасля яго заканчэння вадзе даюць астыць да цёплага стану. Памяшканне, у якім выконваецца праварванне, павінна добра вентылявацца. Ва ўмовах майстэрні **праварванне дубцоў выконвае толькі настаўнік.**

Ваду, у якой праварваюць дубцы, трэба мяняць. У вадзе назапашваюцца рэчывы, якія змяняюць колер дубцоў. Дубцы набудуць карычневы колер, калі іх занадта доўга варыць ці пакінуць на працяглы час у вадзе, у якой яны варыліся. Якасць праварвання вызначаецца пробным акаркаваннем дубцоў. Кара павінна лёгка аддзяляцца ад драўніны.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Акаркаванне лазовых дубцоў выконваюць інструментам **шчамілка.** Шчамілкі бываюць металічныя і драўляныя. Добрая шчамілка забяспечвае хуткае аддзяленне кары ад драўніны і захоўвае гладкай паверхню лазовых дубцоў (мал. 30).

Прынцып дзеяння гэтага інструмента заключаны ў яго назве. У расшчэп (зазор) шчамілкі ўстаўляюць лазовы дубец, пальцамі правай рукі сціскаюць інструмент (шчэмяць лазовы дубец). Праз зазор шчамілкі 1—2 разы працягваюць камлёвую частку дубца, а затым пераварочваюць дубец і такім жа спосабам працягваюць яго вяршынную частку. Шчамілку не трэба сціскаць моцна, таму што яна можа пашкодзіць гладкую бліскучую паверхню дубца, раздушыць яго.

Акаркаванне — працэс працаёмкі. Працоўнае месца пры акаркаванні лазовых дубцоў трэба арганізаваць

*а*  *б*  *в* 

Мал. 30. Шчамілкі для акаркавання лазовых дубцоў:
*а* — металічная; *б* — драўляная;
*в* — тэхніка выканання акаркавання



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

так, каб было зручна і бяспечна працаваць. Акаркоўваюць дубец седзячы. Злева размяшчаюць дубцы неакаркаваныя, справа — акаркаваныя, па цэнтры на падлозе — ёмістасць для кары.

*Патрабаванні да якасці дубца пасля акаркавання:*

- дубцы ачышчаны ад кары цалкам па ўсёй даўжыні;
- дубцы гладкія, без драпін і паломаў;
- кара ачышчана ў ёмістасць.

?

1. Што такое акаркаванне лазовых дубцоў?
2. Для чаго праварваюць лазовы дубец?
3. Колькі часу трэба для праварвання лазы?
4. Пры якіх умовах дубцы могуць змяніць колер?
5. Як называецца інструмент для акаркавання дубцоў?
6. Раскажы, як трэба працаваць шчамілкай.
7. Як трэба арганізаваць працоўнае месца пры акаркаванні лазовых дубцоў?
8. Раскажы пра патрабаванні да якасці дубца пасля акаркавання.

**акаркаванне, шчамілка**

П Правядзі пробнае акаркаванне дубцоў шчамілкай.

ПР Арганізацыя працоўнага месца.

ПР Ачыстка ад кары праварaных лазовых дубцоў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## § 14. Сартаванне і сушка акаркаваных лазовых дубцоў

Сартуюць акаркаваныя дубцы такім жа чынам, як і неакаркаваныя. Так больш зручна хутка падабраць дубцы на будучы выраб. Акаркаваныя дубцы сартуюць па колеры, таўшчыні, даўжыні. Колер акаркаваных дубцоў залежыць ад прыродных фарбуючых рэчываў, якія ўтрымліваюцца ў лазе. Акаркаваныя дубцы бываюць малочна-белага колеру — пры акаркаванні без праварвання (мал. 31, *а*), бэжавага або карычневага — пасля праварвання (мал. 31, *б*, *в*).

Сартаванне акаркаваных лазовых дубцоў па таўшчыні і даўжыні выконваецца тымі ж прыстасаваннямі і спосабамі, што і неакаркаваных.

Пры сартаванні лазы трэба выконваць **правілы бяспекі:**

- працаваць на аддаленай адлегласці адзін ад аднаго;
- берагчы вочы ад вострых канцоў дубцоў.

*а*



*б*



*в*



Мал. 31. Акаркаваныя дубцы:
*а* — без праварвання; *б*, *в* — праваранця



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Яшчэ адзін важны тэхналагічны працэс падрыхтоўкі матэрыялу — **сушка лазовых дубцоў.** Для працяглага захоўвання дубцы неабходна добра прасушыць, бо пасля акаркавання яны маюць павышаную вільготнасць і пры захоўванні пашкоджваюцца цвіллю. Сушаць лазовыя дубцы ў цёплым памяшканні, якое добра праветрываецца, у сонечнае надвор'е — на свежым паветры. Ва ўмовах вытворчасці лазу сушаць у сушыльных камерах.



Мал. 32. Лазовыя дубцы, падрыхтаваныя да захоўвання

Адсартаваныя і высушаныя дубцы звязваюць у пучкі і адпраўляюць на склад для захоўвання. Захоўваюць лазу пры пастаяннай дадатнай тэмпературы і добрай вентыляцыі. Сухія дубцы могуць захоўвацца да 10 гадоў (мал. 32).

?

1. Для чаго сартуюць лазовыя дубцы?
2. Якога колеру бываюць акаркаваныя дубцы? Ад чаго залежыць колер акаркаваных дубцоў?
3. Якія правілы бяспекі трэба выконваць пры сартаванні лазовых дубцоў?
4. Навошта трэба сушыць лазу?

**сушка лазовых дубцоў**



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**ПР** Падрыхтоўка дубцоў да сушкі.

Ход працы

1. Адсартуй высушаныя акаркаваныя лазовыя дубцы па колеры, таўшчыні, даўжыні.
2. Звяжы высушаныя дубцы ў пучкі.
3. Закладзі дубцы на захоўванне.

## § 15. Вяровачка ў тры дубцы

Ты ўжо ведаеш, што вяровачкі ў пляценні бываюць у два, тры, чатыры і больш дубцоў. Чым больш дубцоў адначасова ўдзельнічае ў пляценні вяровачак, тым больш аб'ёмнымі яны атрымліваюцца. Спосаб пляцення **«вяровачка ў тры дубцы»** вельмі часта выкарыстоўваецца ў вырабах з лазы.

*Паслядоўнасць пляцення вяровачкі ў тры дубцы*

1. Паставіць у адтуліны трэнажора стойкі (мал. 33).
2. Узяць тры дубцы і закласці іх камлямі за тры суседнія стойкі — *1, 2, 3*. Дубчыкам *А* абагнуць з добрага боку стойкі *2* і *3*, а стойку *4* — з вываратнага боку і вывесці наперад паміж стойкамі *4* і *5*.
3. Дубчыкам *Б* абагнуць з добрага боку стойкі *3* і *4*, а стойку *5* — з вываратнага боку і вывесці наперад паміж стойкамі *5* і *6*.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне




Мал. 33. Пачатак пляцення вяровачкі ў тры дубцы

4. Дубчыкам *В* абагнуць з добрага боку стойкі *4* і *5*, а стойку *6* — з вываратнага боку і вывесці наперад паміж стойкамі *6* і *7*.

Затым гэтыя прыёмы паўтараюць, пераплятаючы направа кожны крайні левы дубец, абгінаючы ім з добрага боку дзве стойкі, а з вываратнага боку — адну, выводзяць дубец на добры бок. Працягваюць пляценне такім спосабам па крузе да таго часу, пакуль не вернуцца да стойкі, ад якой пачалі пляценне. Калі ў вырабе патрабуецца выканаць некалькі радоў спосабам «вяровачка ў тры дубцы», то неабходна зрабіць плаўны пераход у наступны



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 34. Пераход у новы рад

рад, каб у гэтым месцы не ўтварылася прыступка (мал. 34).

Пераход кожны раз робяць у адным і тым жа месцы, толькі замест крайняга левага дубца бяруць крайні правы і абгінаюць ім дзве стойкі зверху, а трэцюю — ззаду і выводзяць яго ўперад. Такім жа спосабам робяць пераход наступнымі двума дубцамі па чарзе.

Вяровачку ў тры дубцы плятуць, нацягваючы іх злёгку. Пры пляценні не забывайся выраўноўваць і прыціскаць стойкі да формы. Злучаюць дубцы, як і пры пляценні спосабам «вяровачка ў два дубцы» (гл. § 10).

?

1. Для чаго ў вырабах плятуць вяровачкі?
2. Раскажы пра паслядоўнасць пляцення вяровачкі ў тры дубцы і пакажы яе на трэнажоры.
3. Як зрабіць непрыкметным пераход вяровачкі ў наступны рад? Пакажы на трэнажоры.

**вяровачка ў тры дубцы**



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

П

1. Знайдзі вяровачкі ў тры дубцы на ўзорах вырабаў.
2. Выканай вяровачку ў тры дубцы на прамым трэнажоры.
3. Выканай вяровачку ў тры дубцы на круглым трэнажоры.
4. Выканай чаргаванне простага пляцення і пляцення вяровачкі ў тры дубцы.

## § 16. Пляценне вырабаў з гатовым дном

Вырабы з лазовых дубцоў бываюць двух відаў: з плеценым дном і з няплеценым (гатовым дном з іншага матэрыялу). З няплеценым дном можна выканаць кошыкі, кашпо, вазы для садавіны і іншыя рэчы. Па вонкавым выглядзе яны не саступаюць вырабам з плеценым дном (мал. 35).

*а*



*б*



Мал. 35. Вырабы з гатовым дном:
*а* — паднос; *б* — сурвэтніца



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Для няплеценага гатовага дна выкарыстоўваюць такія матэрыялы, як **фанера, ДВП (драўнянавалакністая пліта),** пластык і інш. Матэрыял для дна павінен быць вільгацеўстойлівым, лёгка апрацоўвацца пры вырабе.

Форма гатовага дна можа быць розная: круглая, авальная, прамавугольная або іншая. Яна залежыць ад формы будучага вырабу. Напрыклад, у круглага кошыка дно будзе круглай формы.

У гатовым дне па краі павінны быць прасвідраваны адтуліны. Яны патрэбныя для таго, каб у іх можна было падставіць стойкі для будучага вырабу.

Перад пляценнем гатовае фанернае дно трэба падрыхтаваць: адшліфаваць няроўнасці паверхні наждачнай паперай. Першы этап зачысткі робяць **буйназярністай наждачнай паперай,** другі этап — **дробназярністай наждачнай паперай.** Зачышчаюць паверхню толькі ўздоўж валокнаў фанеры. Гатовае дно павінна быць чыстым і гладкім, а яго край — роўным, гладкім.

Пры зачыстцы дна наждачнай паперай утвараецца драўняны пыл. Змятаць яго з дна і з рабочага стала трэба толькі шчоткай-змёткай. Здзімаць пыл нельга, бо ён можа трапіць у вочы.

Існуе некалькі спосабаў падстаноўкі і замацавання стоек у гатовым дне.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

*Першы спосаб падстаноўкі*
*і замацавання стоек у гатовым дне*

1. Сабраць шаблон для пляцення вырабу, падставіўшы гатовае дно (у дне па цэнтры павінна быць адтуліна).

2. Падставіць у адтуліны нарэзаныя і замочаныя стойкі — іх таўшчыня павінна супадаць з памерам адтулін.

3. Замацаваць стойкі вяровачкай у тры дубцы — два рады.



Мал. 36. Выраб з падстаноўкай стоек першым спосабам

Па заканчэнні пляцення шаблон раскручваюць, форму дастаюць з вырабу. Ніжнія канцы стоек абразаюць на ўзроўні плоскасці дна. Выраб прасушваюць (мал. 36).

Для трываласці ў гатовым вырабе стойкі трэба падклеіць. Для гэтага выраб перавярнуць дном уверх, кропкава нанесці клей ПВА ў месцах, дзе былі адтуліны, і даць клею высахнуць.

*Другі спосаб падстаноўкі і замацавання*
*стоек у гатовым дне*

1. Фанернае дно паставіць на стол кантам так, каб зручна было прасоўваць камлі дубцоў у адтуліны.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 37. Выраб з падстаноўкай стоек другім спосабам

2. У адтуліны ўставіць стойкі, каб канцы дубцоў на 5—7 см выходзілі наверх.

3. Заплесці канцы дубцоў простай загібкай.

4. Паставіць дно загібкай на рабочы стол, выраўнаваць стойкі.

5. Паставіць па цэнтры дна форму, прыціснуць яе грузам.

6. Замацаваць стойкі вяровачкай у тры дубцы (мал. 37).

Пры гэтым спосабе падстаноўкі стоек гатовае дно ўтрымліваецца трывала. Спосаб выкарыстоўваюць для пляцення кошыкаў, каробак і іншых буйных вырабаў.

*Патрабаванні да якасці падстаноўкі і замацавання стоек у гатовым дне другім спосабам:*

- ніжняя загібка без надлому дубцоў;
- выраб стаіць устойліва, не хістаецца.

***Парада.*** Калі кант загібкі атрымаўся не вельмі роўны, выраб не будзе ўстойлівым. Трэба акуратна падрэзаць нажом дубцы, якія выступаюць.

*Паслядоўнасць пляцення вырабу з гатовым дном*

Спосабы пляцення: вяровачка ў тры дубцы, простае пляценне, загібка простая.

1. Падрыхтаваць матэрыял да пляцення (падабраць дубцы і стужку-глянец, нарэзаць стойкі, замачыць).



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

2. Сабраць шаблон, у адтуліны дна падставіць стойкі.

3. Замацаваць стойкі вяровачкай у тры дубцы (2—3 рады).

4. Выплесці сценку вырабу простым спосабам.

5. Выплесці вяровачку ў тры дубцы (2—3 рады).

6. Выплесці верхні кант вырабу простай загібкай.

7. Абрэзаць ніжнія стойкі на ўзроўні плоскасці дна.

8. Дастаць форму.

*Патрабаванні да якасці вырабу з гатовым дном:*

- правільна падабраны матэрыял (па таўшчыні, па колеры);
- стойкі размешчаны на аднолькавай адлегласці адна ад адной;
- пляценне шчыльнае;
- кант вырабу без надлому дубцоў.

?

1. На якія віды падзяляюцца плеценыя вырабы?

2. Назаві матэрыялы, з якіх можна вырабіць няплеценае дно.

3. Раскажы, што трэба зрабіць з фанерным дном перад пляценнем.

4. У якім напрамку зачышчаюць дно наждачнай паперай?

5. Раскажы пра паслядоўнасць падстаноўкі стоек да гатовага дна першым спосабам.

6. Раскажы пра паслядоўнасць падстаноўкі стоек да гатовага дна другім спосабам.

7. Раскажы пра паслядоўнасць пляцення вырабу з гатовым дном.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**фанера, ДВП (драўняна-валакністая пліта);**
**наждачная папера:**
**дробназярністая, буйназярністая**

ПР Пляценне вырабу з гатовым дном.

Ход працы

1. Падрыхтуй фанернае дно, зачысці наждачнай паперай.
2. Спляці кашпо з гатовым дном.
3. Спляці сурвэтніцу з гатовым дном.

## § 17. Выраб сувенірнага кошычка з гатовым донцам і вітай ручкай з двух дубцоў

Слова **«сувенір»** французскага паходжання. У перакладзе яно азначае ‘падарунак на памяць’. Сувенірныя вырабы служаць для ўпрыгожвання памяшкання, стварэння ў ім утульнай абстаноўкі. Адным з такіх упрыгожванняў можа стаць **сувенірны кошычак** (мал. 38). Кошычкі плятуць з тонкіх лазовых дубцоў і стужкі-глянец двух колераў: светлага і цёмнага. Напрыклад, светлай стужкай можна выплесці сценку простым пляценнем, а цёмнай



Мал. 38. Сувенірны кошычак



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

стужачкай выплесці вяровачкі. Цёмнай стужкай выконваецца **аздабленне** кошычка, яго ўпрыгожванне.

*Паслядоўнасць пляцення*
*сувенірнага кошычка*

1. Падрыхтаваць матэрыял для пляцення (падабраць дубцы і стужку-глянец, нарэзаць стойкі, замачыць).
2. Сабраць шаблон, у адтуліны донца падставіць стойкі.
3. Замацаваць стойкі вяровачкай у тры дубцы (2 рады).
4. Выплесці сценку вырабу простым спосабам.
5. Выплесці вяровачку ў тры дубцы (2 рады).
6. Выплесці верхні кант вырабу простай загібкай.
7. Падставіць гатовае донца (пластыкавае, кардоннае).
8. Выплесці ніжні кант простай загібкай.
9. Дастаць форму.
10. Зрабіць ручку.

*Патрабаванні да якасці сувенірнага кошычка:*

- правільна падабраны матэрыял (па таўшчыні, па колеры);
- стойкі размешчаны на аднолькавай адлегласці адна ад адной;
- пляценне шчыльнае;
- кант вырабу без надлому дубцоў, роўны;
- выраб устойлівы.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Па канструкцыі сувенірны кошычак павінен мець такі элемент, як «ручка». У сувенірных вырабах ручка мае толькі дэкаратыўнае прызначэнне, як і сам выраб (для прыгажосці). Таму ручка ў такіх вырабах не павінна быць масіўнай. Варыянтам для сувенірнага кошычка можа быць **вітая ручка**.

Каб зрабіць у сувенірным кошычку вітую ручку, спатрэбяцца наступныя матэрыялы і інструменты: выплецены корпус кошычка, доўгія дубцы дыяметрам 4—5 мм; нож, шыла, бакарэз.

*Паслядоўнасць вырабу вітай ручкі*
*для сувенірнага кошычка*

1. Падрыхтаваць і замачыць матэрыял.
2. Завастрыць з камлёвага канца два дубцы.
3. Павялічыць шылам адтуліну ля стойкі на корпусе кошычка.
4. Уставіць у адтуліну завостраны дубец.
5. Знайсці на корпусе кошычка другую стойку (з процілеглага боку ад устаўленага дубца) (мал. 39, *а*).
6. Уставіць другі завостраны дубец.
7. Пераплесці канцы дубцоў і зацягнуць ручкі да неабходнай вышыні (мал. 39, *б*).
8. Канцы дубцоў перакруціць яшчэ 1—2 разы і ўставіць у адтуліну побач з камлём дубца. Верхавінкі абрэзаць (мал. 39, *в*).
9. Выраўнаваць рукамі ручку (выгнуць, як на ўзоры).



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

*а* *б* *в*



Мал. 39. Паслядоўнасць вырабу вітай ручкі

Даўжыня ручкі залежыць ад велічыні корпуса. Звычайна яе робяць у 1,5—2 разы вышэйшай за корпус.

Для трываласці ручку трэба падклеіць. Клей ПВА кропкава наносіцца ў месцы, дзе ўстаўлена ручка. Затым клею даюць высахнуць.

*Патрабаванні да якасці выканання вітай ручкі:*

- месцы ўстаноўкі ручкі выбраны правільна;
- ручка без надлому дубцоў.

У час працы з шылам і нажом трэба выконваць **правіла:** працаваць спосабам «ад сябе».

1. Што азначае слова «сувенір»?
2. Для чаго служаць сувенірныя вырабы?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

3. Раскажы пра паслядоўнасць вырабу сувенірнага кошычка.
4. Як называецца ручка з двух дубцоў, пераплеценых паміж сабой?
5. Раскажы пра паслядоўнасць вырабу вітай ручкі.
6. Якія ты ведаеш патрабаванні да якасці выканання вітай ручкі?

**сувенір, сувенірны кошычак, аздабленне, ві́тая ручка**

ПР Пляценне сувенірнага кошычка.

Ход працы

1. Падрыхтуй матэрыял для пляцення сувенірнага кошычка.
2. Спляці сувенірны кошычак з гатовым донцам.
3. Вырабі вітую ручку з двух дубцоў.

## § 18. Папластовае пляценне

**Папластовае пляценне** — гэта адзін з відаў суцэльнага пляцення. Называецца яно так таму, што гэтым спосабам можна плесці пластамі, падзяляючы кожны пласт пляцення радамі з вяровачак. Папластовае пляценне выкарыстоўваецца для атрымання сценак вырабаў. Знешні выгляд у папластовага пляцення больш акуратны, чым у простага, паколькі ў гэтым спосабе няма злучэння дубцоў (мал. 40).



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Пры падборы матэрыялу для папластовага пляцення бяруць столькі дубцоў, колькі стоек у вырабе або на трэнажоры. Дубцы павінны быць аднолькавыя па колеры, даўжыні і таўшчыні.



Мал. 40. Выраб, выкананы папластовым пляценнем

Першы рад пляцення пачынаюць адначасова ўсімі дубцамі. Першым дубчыкам аплятаюць адну стойку з добрага боку, другую — з вываратнага боку і пакідаюць яго зверху, не прыціскаючы да трэнажора. Дубец павінен быць злёгку прыўзняты, пад вуглом. Другі і наступныя дубцы закладваюць і праплятаюць гэтак жа, як першы дубец — за кожную левую стойку. Калі ўсе дубцы падстаўлены правільна, то лішніх быць не павінна: колькі стоек — столькі і дубцоў. Усе канцы дубцоў знаходзяцца зверху. З-за кожнай стойкі выходзіць толькі адзін дубец (мал. 41).

*а*



*б*



Мал. 41. Папластовае пляценне: *а* — выгляд збоку; *б* — выгляд зверху



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Другі і наступныя рады таксама плятуць усімі дубцамі па чарзе.

Заканчваюць папластовае пляценне адначасова ўсімі дубцамі, запраўляючы канцы ўнутр вырабу. Чым даўжэйшыя дубцы, тым вышэйшым будзе пласт пляцення.

*Патрабаванні да якасці папластовага пляцення:*

- выкарыстана столькі дубцоў, колькі ў вырабе стоек;
- пляценне шчыльнае;
- адлегласць паміж стойкамі аднолькавая.

?

1. Чаму папластовае пляценне так называецца?
2. Для чаго выкарыстоўваюць папластовае пляценне (гл. форзац 1)?
3. Колькі трэба дубцоў на папластовае пляценне?
4. Назаві патрабаванні да якасці папластовага пляцення.

**папластовае пляценне**

П

1. Падбяры і замачы матэрыял для папластовага пляцення.
2. Выканай пляценне папластовым спосабам у адзін дубец (адну стужку-глянец) на круглым трэнажоры.

ПР

Пляценне сувенірнага кошычка з гатовым донцам і вітай ручкай з двух дубцоў (гл. паслядоўнасць у § 17).

ПР

Выкананне сценкі вырабу папластовым пляценнем.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# РУЧНАЯ ВЫШЫЎКА

## 6 КЛАС

### § 19. Працоўнае месца вышывальшчыцы

**Вышывальшчыца** займаецца вышываннем. З дапамогай нітак і іголкі яна можа ўпрыгожыць сурвэткі, абрусы, навалачкі і іншыя прадметы побыту. Працоўнае месца вышывальшчыцы павінна быць правільна арганізавана. Ад гэтага значна залежыць якасць выкананай работы. Стол з усімі інструментамі і прыстасаваннямі павінен размяшчацца так, каб святло на работу падала з левага боку. Ніткі для вышывання і інструменты лепш захоўваць у скрынках, а лісты з малюнкамі і ўзорамі — у папках. Працоўная вопратка павінна знаходзіцца ў спецыяльна адведзеных месцах.

Пры выкананні работы вельмі важна сачыць за правільнасцю паставы, каб пазбегнуць скрыўлення пазваночніка і пагаршэння зроку. Вышываючы, корпус трэба нахіляць трохі ўперад, ногі можна размясціць на невялікай падстаўцы. Адлегласць паміж работай і вачамі павінна быць 25—30 см. Праз кожныя 20—30 хвілін працы неабходна рабіць



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

перапынак і выконваць гімнастыку для вачэй, каб зняць стомленасць.

Правільная пастаноўка рук у час працы таксама важная. Правая рука павінна знаходзіцца зверху, а левая — унізе пяльцаў. Пры вышыванні на тканінах з рэдкім перапляценнем іголку на вываратны бок тканіны трэба выводзіць вострым канцом уперад правай рукой. На добры бок іголку выводзяць тупым канцом (вушкам) левай рукой. Калі вышыўка выконваецца на шчыльнай тканіне, іголку з вываратнага боку на добры трэба выводзіць вострым канцом уперад.

1. Як правільна арганізаваць працоўнае месца вышывальшчыцы?
2. З якога боку на работу павінна падаць святло?
3. Якую адлегласць паміж работай і вачамі трэба падтрымліваць?
4. У якім становішчы павінны знаходзіцца рукі пры працы на пяльцах?
5. Дзе трэба захоўваць інструменты і матэрыялы?

**вышывальшчыца**

## § 20. Вышыўка як від дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва

**Вышыўка** — такі від дэкаратыўнага мастацтва, у якім узор або карціна выконваюцца з дапамогай іголкі. Вышыўкай упрыгожваюцца вырабы



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

з розных матэрыялаў. Узор або сюжэтны малюнак выконваецца ніткамі, стужкамі, пацеркамі і іншымі матэрыяламі.

Мастацтва вышыўкі вядома людзям здаўна. Некаторыя ўзоры з’явіліся ў глыбокай старажытнасці. Імі аздаблялі касцюмы і прадметы ўжытку. Вышыўку падзялялі на гарадскую і народную. Гарадская вышыўка пастаянна змянялася пад уплывам моды. Народная вышыўка была звязана са старадаўнімі звычаямі. Кожная вышыўка сялян мела сваё прызначэнне, адыгрывала ахоўную ролю. Яе размяшчалі на месцах дакранання цела чалавека з навакольным асяроддзем: па каўняры, на рукавах, па нізе вырабу. Аздабляліся не толькі прадметы адзення, але і побыту: ручнікі, абрусы, фальбоны, дываны, пасцельная бялізна (мал. 42).



Мал. 42. Аздабленне вышыўкай прадметаў побыту



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Для багатых людзей вышыўка выконвалася шаўковымі, залатымі і сярэбранымі ніткамі. У народным побыце вышыўкі былі больш сціплымі.

Для розных народаў характэрныя і розныя асаблівасці ўзору і тэхнікі яго выканання. У **рускай вышыўцы** пераважаюць геаметрычныя і раслінныя арнаменты ў паласе, якія падкрэсліваюць край адзення (мал. 43, *а*). Ва **ўкраінскай вышыўцы** на вопратцы прасочваюцца пышныя арнаменты (мал. 43, *б*). Для **беларускай вышыўкі** характэрныя сакавітыя арнаменты «чырвоным па белым» (мал. 43, *в*).

У старадаўніх беларускіх вышыўках прысутнічаў толькі чырвоны колер. Значна пазней з'явіўся і чорны. У цяперашні час выкарыстоўваецца шматколернасць. У вялікай разнастайнасці арнаментаў спалучаюцца чырвоныя, бардовыя, чорныя, шаравата-блакітныя колеры на белым або шэрым палатне.

*а* *б* *в*



Мал. 43. Вышыўкі розных народаў:
*а* — руская; *б* — украінская; *в* — беларуская



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Многія раёны Беларусі маюць свае асаблівасці ў спалучэнні колераў. Так, шматколернасць часта сустракаецца ў вышыўках Палесся. У Брэсцкай вобласці пераважае блакітны колер. У Гродзенскай больш чорнага і менш чырвонага. У Гомельскай сустракаюцца блакітны і чорны колеры, а таксама вышыўка белым па белым. У Мінскай вобласці часам кашулі вышываюць толькі чорнымі ніткамі.

Беларусам заўсёды падабаўся белы колер: гэта сімвал чысціні, шчырасці, волі. Чырвоны быў колерам сонца, жыцця, радасці. А паколькі жыццё не вечнае, то ў вышыўку дадавалі трохі чорнага колеру.

Жыццё народа заўсёды было звязана з прыродай. Але ў беларускай вышыўцы амаль не бывае канкрэтных выяў раслін, хоць раслінныя арнаменты шматлікія і вельмі разнастайныя. Гэта кветкі, што ператварыліся ў шматпялёсткавыя разеткі, пышныя букеты, павойныя сцёблы.

?

1. Для чаго выкарыстоўваюць вышыўку?
2. Якія вырабы ўпрыгожваюць вышыўкай?
3. Якія ўзоры характэрныя для рускай вышыўкі?
4. Раскажы пра асаблівасці беларускай вышыўкі.

**вышыўка, руская вышыўка,**
**украінская вышыўка, беларуская вышыўка**



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## § 21. Матэрыялы, інструменты і прыстасаванні для ручной вышыўкі

Неабходную тканіну падбіраюць у залежнасці ад прызначэння вырабу і тэхнікі выканання вышыўкі. Для вышывання больш прыдатныя баваўняныя тканіны. Некаторыя работы можна выконваць на бялізнавых тканінах (бязь, мадапалам, гладкафарбаваны паркаль светлых тонаў). З такіх тканін можна шыць сурвэткі, абрусы і аздабляць іх вышыўкай. Тканіны палатнянага перапляцення найбольш зручныя для выканання лічыльных і строчных швоў. На тканінах непалатнянага перапляцення вышываюць па раней нанесеным малюнку або канве. Для вышыўкі па вольна нанесеным контуры ўзору выкарыстоўваюць тканіны, якія маюць гладкую, аднатонную паверхню.

**Канва** — тонкае і мяккае сеткаватае палатно, спецыяльна прызначанае для вышывання. Перапляценні нітак у канве ўтвараюць клеткі рознай велічыні. Шчыльнасць перапляцення нітак неаднолькавая. У канве з буйнымі клеткамі ў 10 см — 40 клетак. Калі ж клеткі канвы больш дробныя, іх на 10 см можа быць 62 і больш. У адной клетцы размяшчаецца адзін крыжык (мал. 44).



Мал. 44. Канва

Канва бывае простая і падвойная. Простая канва падобная па сетку. У падвойнай



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

канвы падоўжныя і папярочныя ніткі ідуць парамі. Па такой канве зручней вышываць крыжам. Выраб атрымліваецца больш акуратны.

Канву можна зрабіць самастойна. Для гэтага трэба ўзяць тканіну з палатняным перапляценнем. Адлічыць кожную трэцюю далявую нітку, падрэзаць яе ў пачатку нажнічкамі і выцягнуць. Таксама паступіць і з папярочнай ніткай. У выніку атрымаецца сетка са спараных нітак. Кожная клетачка будзе адпавядаць аднаму крыжу.

Канву накладваюць на тканіну на месца мяркуемага ўзору. Прымацоўваць канву на рабочую тканіну трэба швом «уперад іголку» спачатку па нітцы асновы, а потым па ўтку. Узор трэба размяшчаць уздоўж нітак асновы. Па канве лепш вышываць у адным напрамку — па нітках асновы, каб пазбегнуць скажэння малюнка.

Для вышывання выкарыстоўваюць розныя ніткі (мулінэ, ірыс, шарсцяныя і шаўковыя) у залежнасці ад віду тканіны. Ніткі для вышывання маюць розную ўпакоўку: шпулькі, клубкі, маткі, патроны-трубкі (мал. 45).



Мал. 45. Віды ўпаковак нітак



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Часцей за ўсё для вышывання карыстаюцца ніткамі **мулінэ.** Яны маюць яркую ўстойлівую афарбоўку, бляск і неабходную трываласць. Кожная пасма нітак мулінэ **складаецца з шасці тонкіх нітак, якія лёгка аддзяляюцца адна ад адной.** Маток мулінэ раскрываюць і разразаюць у тым месцы, дзе ёсць вузел. Каб нітка ў час працы не блыталася, даўжыня яе павінна быць не большай за 50 см.

Для вышывання буйных малюнкаў выкарыстоўваюць мулінэ ў пасму (6 нітак), ірыс, шарсцяныя і сінтэтычныя ніткі. Выкарыстоўваюць таксама ніткі, выцягнутыя з тканіны, а ў накладным шыцці — шнур, тасьму, сутаж. Для аздаблення вырабаў прыдатныя бісер, шклярус, блішчынкі.

**Бісер** — дробныя, круглыя або шматгранныя, злёгку пляскатыя пацеркі са шкла або пластмасы з адтулінамі для прадзявання ніткі. **Шклярус** — адрэзкі тонкай шкляной трубкі даўжынёй 3—10 мм. **Блішчынкі** — тонкія круглыя або фігурныя пласцінкі з металу, каляровага і люстранога шкла, пластмас дыяметрам ад 2 да 20 мм.

Для вышывальных прац неабходна мець іголкі рознай даўжыні і таўшчыні — ад № 1 да № 12. Іголка № 1 мае даўжыню 35 мм, дыяметр 0,6 мм; іголка № 12 — даўжыню 70 мм, дыяметр 1,8 мм. Іголкі, якія маюць цотныя нумары, кароткія і тоўстыя, іголкі з няцотнымі нумарамі — тонкія і



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

доўгія. Для працы з бісерам і шклярусам карыстаюцца вельмі тонкімі іголкамі (№ 1, 2). Для вышывання на тонкіх тканінах выкарыстоўваюць іголкі № 2, 3, на льняных тканінах — № 4, 5. Для працы на шчыльных тканінах, а таксама для вышывання ірысам, тасьмой патрэбны тоўстыя іголкі з вялікім авальным вушкам (№ 6—12).

**Пяльцы** — спецыяльнае прыстасаванне для нацягвання тканіны пры вышыванні (мал. 46). Яны бываюць драўляныя, металічныя і пластмасавыя. Па форме — круглыя, квадратныя і прамавугольныя. Для невялікіх вырабаў зручныя круглыя пяльцы. Яны складаюцца з двух абручоў — большага і меншага. Меншы абруч павінен свабодна ўваходзіць у большы абруч і ўтрымліваць тканіну ў нацягнутым стане. Пажадана, каб на пяльцах было прыстасаванне для замацавання — шруба. З дапамогай шрубы на прыстасаванні можна рэгуляваць нацяжэнне. Гэта дазволіць запяліваць матэрыял любой таўшчыні і пастаянна падтрымліваць тканіну ў нацягнутым стане. Для вышывання неабходна не менш за двое пяльцаў рознага дыяметра.



Мал. 46. Пяльцы



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Пяльцамі карыстаюцца наступным чынам:

- на меншы абруч кладуць тканіну з пераведзеным малюнкам;
- зверху надзяваюць большы абруч, добра нацягваюць тканіну і з дапамогай шрубы (калі яна ёсць) заціскаюць яе паміж абручамі;
- трэба сачыць, каб малюнак не быў перакошаным.

***Парада.*** Калі тканіна тонкая і нацягнута слаба, можна па крузе пяльцаў пракласці палоскі больш шчыльнай тканіны. Такім чынам тонкая тканіна захоўваецца ад пашкоджання, а абручы пяльцаў будуць больш шчыльна заходзіць адзін у адзін.

Калі вышыўка выконваецца на маленькім кавалачку тканіны або малюнак размешчаны ля краю вырабу, па краях асноўнай тканіны можна прышыць дадатковыя палоскі, якія ў канцы працы лёгка выдаляюцца.

Для працы патрэбныя нажніцы двух відаў. Абразаць ніткі пры вышыванні лепш маленькімі нажніцамі з вострымі загнутымі канцамі. Для разразання маткоў нітак, раскрою тканіны больш зручныя вялікія нажніцы. Неабходна сачыць за тым, каб нажніцы былі добра завостраныя.

Для заняткаў вышываннем неабходныя шпількі, напарстак, лінейка, капіравальная папера для пераводу малюнкаў, алоўкі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Назаві тканіны, прыдатныя для вышывання.
2. Для чаго выкарыстоўваецца канва?
3. Назаві віды канвы.
4. Назаві ніткі, якімі выконваюць вышыўкі.
5. Якое прыстасаванне дапамагае ўтрымліваць тканіну ў нацягнутым стане?
6. Назаві інструменты для вышывання, раскажы пра іх прызначэнне.

**канва, мулінэ, пасма, бісер, шклярус, блішчынкі, пяльцы**

## § 22. Правілы бяспекі пры карыстанні інструментамі

У час заняткаў вышываннем неабходна прытрымлівацца **правіл бяспекі:**

• пры працы са шпількамі і іголкамі быць асцярожным, захоўваць іх у спецыяльных скрыначках;

• не ўколваць іголкі і шпількі ў вопратку ці пакідаць іх на працоўным месцы. Яны павінны знаходзіцца ўігольніцах;

• іголка заўсёды павінна быць з ніткай: калі яна згубіцца, яе лягчэй будзе знайсці;

• не карыстацца іржавай іголкай, яна дрэнна праколвае тканіну, пакідае на ёй сляды ржы і можа лёгка зламацца;

• кавалачкі зламанай іголкі, перш чым выкінуць, загарнуць у паперу;



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

• не адкусваць нітку — гэта псуе зубы. Для аддзялення ніткі патрэбнай даўжыні карыстацца толькі нажніцамі.

Некаторыя віды вышыўкі (аздобныя швы, крыжык, ажурная вышыўка) можна выконваць і без пяльцаў (мал. 47). У гэтым выпадку правілы такія: іголку трэба трымаць вялікім і ўказальным пальцамі правай рукі, а тканіну — левай рукой. Тканіна павінна ляжаць на ўказальным, сярэднім і безназоўным пальцах левай рукі. Вялікім пальцам левай рукі тканіну неабходна прытрымліваць, адначасова прыціскаючы яе знізу мезенцам.

Нажніцы ў час працы трэба пакласці з боку рабочай рукі, кольцамі да сябе. Перадаваць нажніцы кольцамі ўперад і з закрытымі лёзамі. Старайся не губляць нажніцы — падаючы на падлогу, яны могуць параніць, а лёзы нажніц пры падзенні псуюцца.



Мал. 47. Вышыванне без пяльцаў



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Да пачатку працы неабходна вымыць і добра выцерці рукі. Калі браць іголку вільготнымі рукамі, яна слізгаціць і дрэнна праколвае тканіну. Да таго ж ад вільготных пальцаў на вырабе могуць застацца сляды.

На працоўным месцы неабходна захоўваць парадак: не раскідваць абрэзкі нітак, збіраць іх у спецыяльна адведзенае месца. Пры заканчэнні працы вышыўку складваюць разам з ніткамі і прыбіраюць у адведзенае месца.

1. Дзе трэба захоўваць іголкі і шпількі?
2. Чаму іголка заўсёды павінна быць з ніткай?
3. Пакажы правільнае становішча рук у час вышывання без пяльцаў.
4. Пералічы правілы бяспекі працы з нажніцамі.
5. Растлумач, чаму нельга працаваць вільготнымі рукамі.

# ПРОСТЫЯ ШВЫ І ІХ КАМБІНАВАННЕ

## § 23. Віды простых швоў

Існуе вялікая разнастайнасць швоў (гл. форзац 2). Кожнае мае сваю назву і прызначэнне. Напрыклад, аздобныя швы выкарыстоўваюцца для ўпрыгожвання вырабаў рознымі відамі вышыўкі.

Для выканання ручных швоў іголку з ніткай уводзяць у тканіну, а потым выводзяць з яе. Пры гэтым на тканіне застаецца след ніткі, яго называюць



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

шыўком. **Шывок** — гэта адлегласць паміж праколамі іголкі. Аднолькавыя шыўкі, якія ідуць адзін за адным, утвараюць *шво*. Шывок можа быць даўжынёй ад 1,5 мм да 3 см, можа выконвацца ў адным напрамку або мець нахіл у які-небудзь бок. Даўжыня шыўка залежыць ад тканіны, на якой выконваецца вышыўка. Чым большая таўшчыня тканіны, тым большая даўжыня шыўка.

У народных вышыўках заўсёды карысталіся адначасова некалькімі відамі швоў. Яны дапаўнялі, упрыгожвалі ўзор і стваралі яго непаўторнасць.

**Шво «ўперад іголку»** выкарыстоўваецца ў шыцці і вышыванні. Можа выконвацца і па намаляваным контуры, і на аснове адліку нітак тканіны. Ход працы — справа налева. Іголка ўводзіцца і выводзіцца па гарызанталі ў роўных інтэрвалах (мал. 48, *а*).

Даўжыня шыўкоў у шве «ўперад іголку» можа быць рознай, гэта залежыць ад тэхнікі выканання вышыўкі. Напрыклад, у белай гладзі такім швом абводзіцца контур узору і шыўкі маюць даўжыню

*а*



*б*



Мал. 48. Шво «ўперад іголку»



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1—2 мм. У лічыльнай вышыўцы шыўкі маюць даўжыню 3—4 мм, калі вышыўка цалкам выконваецца такім швом — 6—8 мм.

Некалькі радоў, вышытых непасрэдна адзін пад адным, ствараюць сціплы геаметрычны малюнак (мал. 48, *б*). Больш складаныя ўзоры атрымліваюць шляхам чаргавання шыўкоў рознай даўжыні і розных інтэрвалаў.

Шво «ўперад іголку» з перавіваннем з'яўляецца аздобным швом. Яно выконваецца ў два прыёмы. Спачатку прашываюць па лініі малюнка швом «уперад іголку». Затым змяняюць колер ніткі, замацоўваюць яе ў пачатку радка і чапляюць іголкай кожны шывок. Калі іголку падводзіць пад кожны шывок то зверху, то знізу, нітка кладзецца паміж шыўкамі змейкай (мал. 49, *а*). Калі іголка рухаецца спіраллю, атрымліваецца вяровачка (мал. 49, *б*).

Шво «ўперад іголку» выкарыстоўваецца ў вышыўцы часцей як самастойнае, але часам і ў спалучэнні са

*а*



*б*



Мал. 49. Шво «ўперад іголку» з пераваннем



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

сцяблінiстым швом. Гэты від вышыўкі мае шмат пераваг: праца выконваецца хутка, вываратны бок застаецца чыстым. Для таго каб шыўкі цалкам пакрывалі матэрыял, трэба браць тоўстыя ніткі. Пры вышыванні тонкімі ніткамі аснова прасвечваецца паміж шыўкамі і вышыўка глядзіцца неакуратна.

П Выканай шво «ўперад іголку» на ўзоры.

**Сцяблінiстае шво** з'яўляецца аздобным швом. Шво выконваецца злева направа і па знешнім выглядзе нагадвае віткі шнура. Зрабіўшы пракол з вываратнага на добры бок, прапускаюць некалькі нітак на тканіне. Іголку накіроўваюць уніз і выцягваюць на добры бок пасярэдзіне першага шыўка. Наступны пракол робяць, адступіўшы ад канца першага на палову яго даўжыні. Іголку выводзяць з вываратнага на добры бок праз пракол, якім заканчваецца папярэдні шывок (мал. 50, *а*). Кожны новы шывок пачынаецца з сярэдзіны папярэдняга шыўка. На вываратным баку атрымліваецца шво, падобнае на строчку (мал. 50, *б*).

*а*



*б*



Мал. 50. Сцяблінiстае шво:
*а* — добры бок; *б* — вываратны бок



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Калі шыўкі з вонкавага боку дробныя, то шво атрымліваецца больш акуратным і шчыльным. Падоўжаныя шыўкі робяць шво больш расцягнутым. Работа такімі шыўкамі выконваецца хутка, але выглядае не зусім акуратна.

Сцяблiністым швом вышываюць контурныя ўзоры, галінкі і сцяблінкі, дзіцячыя малюнкі.

**П** Выканай сцяблiністае шво на ўзоры.

**Тамбурнае шво** (ланцужок) уяўляе сабой беспярапынны рад петляў, якія выходзяць адна з адной (мал. 51). Петлі могуць быць рознай даўжыні і мець розны напрамак. Гэтым швом вышываюць контуры і дэкаратыўныя малюнкі, калі неабходна суцэльнае запаўненне ўзору. Усе віды тамбурнага шва выконваюцца зверху ўніз.




Мал. 51. Тамбурнае шво:
*а* — добры бок;
*б* — вываратны бок

Пачынаюць тамбурнае шво вывядзеннем іголкі разам з ніткай з вываратнага боку на добры. Выцягнутую нітку ўкладваюць на добрым баку пятлёй. Яе прытрымліваюць вялікім пальцам левай рукі. Іголку ўводзяць з добрага боку на вываратны ў той жа



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

пракол, з якога вывелі нітку, і, прапусціўшы некалькі нітак тканіны, выводзяць яе на добры бок. Пракол павінен быць унутры пятлі. Лёгка выдаляючы нітку, утвараюць выцягнутае кольца. Наступны пракол робяць у месцы выхаду ніткі.

Тамбурнае шво можна выконваць таксама ў выглядзе зігзагападобнай паласы. У гэтым выпадку шыўкі па вываратным боку і петлі па добрым будуць размяшчацца па чарзе — то злева, то справа ад сярэдняй лініі шва.

Гэтае шво распускаецца, калі пасля яго выканання пацягнуць за канец ніткі. Улічваючы гэта, трэба добра замацоўваць канец ніткі ў працэсе працы.

**П** Выканай тамбурнае шво на ўзоры.

**Аксамітнае шво** (козлік) — гэта аздобнае шво. Яго выконваюць паміж дзвюма паралельнымі лініямі шырынёй ад 5 да 10 мм. Па вонкавым выглядзе яно ўяўляе сабой перакрыжаваныя нахільныя шыўкі (мал. 52, *а*). Шво выконваецца злева направа. Шыўкі кладуцца па чарзе на верхняй і ніжняй дапаможных лініях. Праколы тканіны іголкай робяць справа налева. Іголка пры працы заўсёды павернута вострым канцом улева. На вываратным баку ўзнікаюць два рады кароткіх гарызантальных шыўкоў (мал. 52, *б*).

У час працы тканіну прытрымліваюць у нацягнутым стане на ўказальным пальцы левай рукі. Нітку замацоўваюць злева ў ніжнім радзе (*1*). Затым



Правообладатель Адукацыя і выхаванне




Мал. 52. Аксамітнае шво
і яго варыянты

з добрага боку робяць іголкай пракол на верхняй лініі справа налева (*2*—*3*) і працягваюць нітку. Утворыцца нахільны шывок (*1*—*2*). Другі шывок робяць злева направа (*3*—*4*) і замацоўваюць яго з дапамогай іголкі на ніжняй лініі (*4*—*5*). У месцах скрыжавання кожны новы шывок кладзецца над папярэднім.

Козлік, вышыты каляровымі ніткамі ў 2—3 і больш радоў, называецца «аксамітным». Ён патрабуе трапнага спалучэння колераў і строгага іх чаргавання (мал. 52, *в*).

П Выканай аксамітнае шво на ўзоры.

**Пяцельным швом** абкідаюць петлі, апрацоўваюць зрэзы сурвэтак, каўняроў. Ім можна па контуры вышыць узоры.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Пяцельнае шво складаецца з шыўкоў, раўнамерна зацягнутых петлямі. Шыўкі могуць быць рэдкія або частыя. У гэтым шве яны ўкладваюцца вертыкальна (мал. 53, *а*). Даўжыня вертыкальных шыўкоў залежыць ад вырабу і складае ад 2 да 5 мм.

Пяцельнае шво выконваецца як злева направа, так і справа налева. Працуючы, неабходна сачыць за тым, каб праколы рабіліся на аднолькавай адлегласці адзін ад аднаго і ад краю вырабу. Вышыня шыўкоў і адлегласць паміж імі змяняюцца ў залежнасці ад характару работы (мал. 53, *б*). Тканіну праколваюць іголкай зверху ўніз, нітка пры гэтым заўсёды застаецца пад іголкай, працягваюць рабочую нітку да ўтварэння пятлі. Шво мае некалькі варыянтаў.

*а*



*б*



*в*



Мал. 53. Пяцельнае шво і яго варыянты



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Пяцельным швом можна вышываць па прамой, у выглядзе фестонаў, па крузе. Каб надаць аб'ём, пяцельнае шво выконваюць па насціле (мал. 53, *в*).

**У** Выканай пяцельнае шво на ўзоры.

**?**
1. Як называюць адлегласць паміж двума праколамі іголкі?
2. Ад чаго залежыць даўжыня шыўка?
3. Назаві віды простых аздобных швоў (на ўзорах).
4. Раскажы, дзе прымяняюцца гэтыя швы.
5. Якія швы выконваюцца злева направа?
6. Якія швы выконваюцца зверху ўніз?
7. Разгледзь узоры вышытых вырабаў. Вызначы і назаві, якія віды швоў выкарыстоўваліся.

**шывок, шво, швы: «уперад іголку», сцяблістае, тамбурнае, аксамітнае, пяцельнае**

## § 24. Падрыхтоўка да вышывання. Выбар, перавод і змяненне малюнка

Пры выбары малюнка для вышывання трэба ўлічваць прызначэнне вырабу і тэхніку вышывання. Усе малюнкі можна ўмоўна падзяліць на малюнкі вольнага контуру і спецыяльныя.

Да **малюнкаў вольнага контуру** адносяцца такія, якія могуць быць выкананы ад рукі або пераведзеныя з іншага малюнка. Іх можна павялічыць, паменшыць, змяніць размяшчэнне асобных дэталяў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Пры гэтым сэнс малюнка моцна не змяняецца (мал. 54).

Малюнкі вольнага контуру могуць выконвацца аздобнымі швамі, гладдзю, бісерам і г. д. Для аднаго і таго ж узору можна выбраць розныя швы. І тады кожны раз малюнак будзе выглядаць па-рознаму.

**Спецыяльнымі** называюць такія малюнкі, якія абмежаваны даўжынёй шыўка або рамкамі клеткі (мал. 55). Іх нельга выцягваць, зрушваць, памяншаць. Спецыяльныя малюнкі часцей за ўсё выконваюцца лічыльнай гладдзю або крыжам.

Па характары выявы малюнкі можна падзяліць на групы. Гэта могуць быць геаметрычныя малюнкі (узоры, складзеныя з прамых ліній, квадратаў,

*а*  *б* 

Мал. 54. Малюнкі вольнага контуру:
*а* — зададзены малюнак; *б* — зменены



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 55. Спецыяльныя малюнкі

ромбаў і інш.), малюнкі з кветкавымі матывамі, пейзажы і інш.

Выбраўшы для работы ўзор, трэба падабраць тканіну неабходнай структуры, якасці і колеру. Перш чым прыступіць да вышывання, трэба выраўнаваць зрэзы тканіны, размеціць на ёй размяшчэнне малюнка, нанесці ўзор. Калі ўзор геаметрычны, а тканіна з выразным перапляценнем нітак, яго можна выконваць, лічачы ніткі тканіны. Гэты спосаб выкарыстоўваюць для вышывання лічыльнымі швамі.

Самы просты спосаб пераводу малюнка на тканіну — пры дапамозе **капіравальнай** паперы (мал. 56). На адным баку паперы нанесена паста. На выпрасаваную тканіну на месцы вышыўкі



Мал. 56. Перавод малюнка на тканіну праз капіравальную паперу



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

накладваюць капіравальную паперу пастай на тканіну. Лепш выкарыстоўваць каляровую капіравальную паперу — жоўтую, чырвоную, зялёную, яна менш забруджвае вышывальныя ніткі. Для светлай тканіны патрэбна папера цёмнага колеру, для цёмнай — светлага. Малюнак кладзецца зверху, і ўсё змацоўваецца пры дапамозе шпілек. Добра завостраным алоўкам акуратна абводзяць контуры вольнага малюнка. Контуры геаметрычнага малюнка абводзяць з дапамогай лінейкі або ставяць кропкі па вуглах кожнага крыжа.

Для пераводу малюнка на любую тканіну можна выкарыстоўваць **прыём прыпарушвання** (мал. 57).

Спачатку ўзор пераводзіцца на кальку. Кальку ўкладваюць на тоўстую тканіну. Праз роўныя прамежкі (не больш за 2—3 мм) па контуры праколваюць дзірачкі. Праколы робяць з дапамогай тоўстай іголкі.


Мал. 57. Прыём прыпарушвання

Падрыхтаваны да прыпарушвання малюнак укладваюць на тканіну з добрага боку і шчыльна прымацоўваюць шпількамі. Пасля гэтага паверхню прысыпаюць парашком (пудрай, мелам, сінькай). Ён пранікае праз дзірачкі і пакідае на тканіне кропкі. Злучыўшы



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

гэтыя кропкі, можна атрымаць контур малюнка. Пры гэтым узор малюнка не скажаецца.

1. На якія групы можна падзяліць усе малюнкі?
2. Назаві малюнкі вольнага контуру.
3. Чым абмежаваныя спецыяльныя малюнкі?
4. Назаві спосабы пераводу малюнка на тканіну.

**малюнкі вольнага контуру, спецыяльныя малюнкі, капіравальная папера, прыём прыпарушвання**

ПР Пераvод малюнка на тканіну метадам «прыпарушвання».

Ход працы

1. Складзі ў некалькі пластоў мяккую тканіну, засцялі стол.

2. На стол пакладзі ліст паперы з нанесеным малюнкам.

3. Падкладзі пад ліст з малюнкам паперу або кальку.

4. Прымацуй усё да падсцілкі.

5. Зрабі праколы па контуры малюнка (тоўстай іголкай або шылам) на адлегласці 2—3 мм адзін ад аднаго.

6. Гатовы трафарэт прашаруй наждачнай паперай, каб выправіць няроўнасці контуру.

7. Прымацуй трафарэт да паверхні тканіны для вышывання.

8. Прысып паверхню мелам (пудрай, сінькай).

9. Акуратна здымі трафарэт.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Часам неабходна не толькі перавесці малюнак на тканіну, але і павялічыць або паменшыць яго (мал. 58).

**ПР** Змяненне памераў малюнка.

Ход працы

1. Разбі малюнак на клеткі аднолькавага памеру (мал. 58, *а*).

2. Нанясі сетку з клетак на паперу, прыгатаваную для новага малюнка. Для павелічэння малюнка клеткі трэба павялічыць, для памяншэння — паменшыць.

3. У кожнай клетцы дакладна паўтары дэталі малюнка (мал. 58, *б*, *в*).




Мал. 58. Змяненне памераў малюнка:
*а* — зададзены малюнак; *б* — павялічаны; *в* — паменшаны



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## § 25. Падбор тканіны і нітак для вышывання

У залежнасці ад прызначэння будучага вырабу і тэхнікі вышывання падбіраюць неабходную тканіну. Для абрусаў, дарожак, сурвэтак лепш узяць лён або суровае палатно. Для пано і дыванкоў выкарыстоўваюць рагожку, палатно, бартоўку, сукно, шарсцянку. Для сумак і газетніц падыдзе любая тканіна.

Вельмі важна правільна падабраць ніткі па колеры. Колеры сонечнага спектра падзяляюць на: **асноўныя** — чырвоны, жоўты, сіні і **прамежкавыя** — аранжавы, зялёны, фіялетавы. Ёсць таксама бясколерныя, або **нейтральныя**, колеры. Гэта белы, чорны, шэры і ўсе іх адценні.

Важна, каб колеры і іх адценні гарманічна спалучаліся. Добра спалучаюцца:

- чырвоны — з чорным, жоўтым, шэрым, бэжавым, аранжавым, сінім, белым;
- сіні — з шэрым, блакітным, бэжавым, карычневым, жоўтым, ружовым, залацістым;
- жоўты — з карычневым, чорным, чырвоным, аранжавым, шэрым, блакітным, сінім, фіялетавым;
- зялёны — з жоўтым, лімонным, шэрым, аранжавым, карычневым, чорным.

***Парада.*** Падбіраць ніткі для вышывання трэба пры дзённым асвятленні, паколькі электрычнае святло можа скажаць колер. У такім выпадку вышыўка атрымаецца зусім з іншай колеравай гамай.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Неабходна праверыць ніткі на **лінючасць** — трываласць афарбоўкі. Для гэтага нітку трэба апусціць у гарачую ваду, потым злёгку намыліць і працягнуць праз удвая згорнутую белую тканіну. Калі на тканіне застаўся след фарбы, усе ніткі трэба апусціць у гарачы мыльны раствор на 15 хвілін, потым выпаласкаць у некалькіх водах.

Для вышывання буйных малюнкаў прыдатныя мулінэ ў пасму (6 нітак), ірыс, шарсцяныя і сінтэтычныя ніткі. Выкарыстоўваюць таксама ніткі, выцягнутыя з тканіны.

Падабраўшы для работы ніткі і тканіну, трэба выраўнаваць краі тканіны. Для гэтага выцягваюць крайнюю нітку і па яе следзе зразаюць лішнюю тканіну. Выцягваючы ніткі або выкарыстоўваючы фастрыгоўку, пракладваюць лініі, якія вызначаюць памеры вырабу, шырыню падгінання, шырыню махроў. Пасля гэтага тканіну добра распрасоўваюць і, калі трэба, запяльваюць.

?

1. Ад чаго залежыць выбар тканіны?
2. Назаві асноўныя, прамежкавыя і нейтральныя колеры.
3. Пры якім асвятленні трэба падбіраць ніткі?
4. Як праверыць ніткі на лінючасць?
5. Як выраўнаваць краі тканіны?

**колеры: асноўныя, прамежкавыя, нейтральныя; лінючасць**



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## § 26. Замацаванне рабочай ніткі

У адрозненне ад шыцця, у вышыванні не прынята рабіць вузельчыкаў, пакідаць на вывааратным баку петлі і канцы нітак. У народнай вышыўцы вываратны бок заўсёды чысты, праца выканана акуратна. Існуе некалькі спосабаў замацавання канцоў нітак. Пры вышыванні адзінарнай ніткай яе канцы замацоўваюць некалькімі дробнымі шыўкамі ў тым месцы, якое па ходзе працы закрыецца вышыўкай (мал. 59, *а*).

Пасля першага праколу канец ніткі даўжынёй 10 мм можна пакінуць на вываратным баку і замацаваць яго, прапускаючы іголку з ніткай пад вышытымі шыўкамі (мал. 59, *б*).

Можна замацаваць канец ніткі шыўком «за іголку». Робяць пракол іголкай з вываратнага боку



Мал. 59. Спосабы замацавання рабочай ніткі



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

на добры, працягваюць іголку і пакідаюць на вываратным баку канец ніткі даўжынёй 10—15 мм, моцна яго прытрымліваючы. Вельмі блізка ад першага пракола злева направа робяць другі пракол на вываратны бок і выводзяць іголку з ніткай на добры бок, замацоўваючы ёю пакінуты канец ніткі (мал. 59, *в*).

Калі вышываюць у дзве ніткі, то складзеную ўдвая нітку прасоўваюць канцамі ў вушка іголкі. Затым робяць маленькі шывок у месцы пачатку працы і цягнуць нітку да таго часу, пакуль не застанецца кончык у выглядзе маленькай пяцелькі, якая ўтварылася пры складванні ніткі ўдвая. У гэтую пятлю прасоўваюць іголку з рабочай ніткай і зацягваюць яе (мал. 59, *г*).

Заканчваючы працу, нітку замацоўваюць пад вышыўкай з вываратнага боку некалькімі дробнымі шыўкамі швом «уперад іголку» або «назад іголку», а канцы абразаюць нажніцамі.

?

1. Якія прыёмы замацавання ніткі пры вышыванні адзінарнай ніткай ты ведаеш?
2. Як замацоўваецца падвойная нітка?
3. Як замацоўваецца нітка ў канцы вышыўкі?

П

1. Замацуй нітку ў пачатку працы living рознымі прыёмамі.
2. Замацуй нітку ў канцы працы рознымі прыёмамі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## § 27. Лічыльныя і вольныя швы

**Лічыльныя швы** — найбольш распаўсюджаныя швы для вышывання. Да іх належаць швы: «набор», крыжык, лічыльная гладзь, коска і інш. У цяперашні час матывы ўзораў і прыёмы іх выканання лічыльнымі швамі прымяняюцца для афармлення сурвэтак, канапавых падушак, пано, адзення.

У народных вышыўках пераважаюць геаметрычныя арнаменты. Яны выконваюцца швом **«набор»**. Шво «набор» — гэта двухбаковае хуткае шыццё, якое падобна да ўзорнага ткацтва. Выконваецца яно шыўкамі рознай даўжыні шва «ўперад іголку» (мал. 60).

Узоры «набору» складаюць паралельныя рады гарызантальных або вертыкальных шыўкоў, укладзеных на адлегласці адной або дзвюх нітак. Шыўкі не павінны быць вельмі доўгімі, каб не выцягваліся ў



Мал. 60. Шво «набор» і яго варыянты



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

працэсе карыстання. Даўжыня шыўка залежыць ад гатунку і таўшчыні ніткі і тканіны.

«Наборы» выкарыстоўваюць як самастойны від вышыўкі, так і ў спалучэнні з іншымі швамі. Гэта адна са старажытных тэхнік народнага вышывання. У Беларусі такую тэхніку называюць «нацяг», «нацягванне».

У народных вышыўках узоры «набораў» выконваліся пераважна чырвонымі ніткамі з нязначным дадаваннем сініх або чорных. Імі аздаблялі рукавы, каўняры і ніз кашуль, а таксама фартухі, ручнікі, хусткі.

**Лічыльная гладзь** — адна з найбольш старажытных тэхнік вышывання. Пры вышыванні лічыльнай гладдзю малюнак не пераводзіцца на палатно. Ён вышываецца на тканіне па ўзоры з дапамогай адліку нітак. Для лічыльнай гладзі выбіраюць тканіну з палатняным перапляценнем. На ёй раўнамерна размешчаны і добра бачныя ніткі асновы і ўтку.

Лічыльная гладзь бывае **адна-** і **двухбаковай**. Вышыванне вядзецца па ліку нітак тканіны паралельнымі шыўкамі, якія знаходзяцца на адлегласці адной ніткі адзін ад аднаго. У залежнасці ад напрамку шыўкоў гладзь бывае прамая і косая. У прамой гладзі шыўкі кладуцца ўздоўж нітак тканіны па гарызанталі і вертыкалі, а ў косай — з розным нахілам (мал. 61).

Тэхніка выканання лічыльнай гладзі простая. Вышываюць злева направа. Іголку выводзяць і ўводзяць у напрамку асновы праз пэўную колькасць нітак.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне




Мал. 61. Лічыльная гладзь: *а* — аднабаковая; *б, в* — двухбаковая

Выводзяць іголку з вываратнага боку на добры, адлічваюць патрэбную колькасць нітак і ўводзяць іголку на вываратны бок. Шыўкі кладуць часта, раўнамерна іх зацягваюць і накіроўваюць так, як таго патрабуе малюнак. Пры гэтай тэхніцы вываратны і добры бакі выглядаюць аднолькава.

У даўнейшыя часы лічыльная гладзь вышывалася ніткамі белага і шэрага колераў, якія заставаліся ад ткання палатна, а таксама чырвонымі і чорнымі. Магчымыя і іншыя варыянты. Ніткі павінны быць мяккімі, каб шыўкі добра пакрывалі тканіну. Лічыльная гладзь вышываецца ніткамі аднаго або двух колераў, можа быць і шматколернай (мал. 62).

Лічыльная гладзь часта дапаўняецца іншымі швамі: крыжам, зігзагам, аксамітным швом і іншымі элементамі. Гэта дазваляе ствараць незлічонае мноства малюнкаў.

У сучаснай вышыўцы выкарыстоўваецца шмат дэкаратыўных швоў, якія ўпрыгожваюць адзенне і прадметы



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 62. Лічыльная гладзь:
*а* — у адзін колер; *б* — у два колеры; *в* — шматколерная

побыту. Да **вольных швоў** належаць сцяблінiстае, тамбурнае і яго варыянты (гл. мал. 50, 51), шво «ланцужок» і яго варыянты, шво «пятля ўпрымацоўку».

**Шво** «ланцужок» — глухое аднабаковае шво. Складаецца з рада пяцелек, якія выходзяць адна з адной (мал. 63, *а*). Вышываюць яго зверху ўніз, справа налева па контуры малюнка. Форма ланцужкоў залежыць ад памеру шыўкоў (доўгія і кароткія, вузкія і шырокія), іх нахілу (мал. 63, *б*).



Правообладатель Адукацыя і выхаванне




Мал. 63. Шво «ланцужок»:
*а* — паслядоўнасць выканання; *б* — яго варыянты

Ланцужком вышываюць пераважна раслінныя арнаменты па контуры малюнка, запаўняюць асобныя дэталі або ўсю плошчу малюнка.

**Шво «пятля ўпрымацоўку»** створана на аснове тамбурнага шва і складаецца з мноства ізаляваных петляў, размешчаных па ўзоры. У залежнасці ад прызначэння вырабу, фактуры тканіны, выбранага ўзору падбіраецца таўшчыня нітак.

Каб зрабіць пятлю, трэба замацаваць нітку на вываратным баку, вывесці яе на добры бок (*1*) і адкінуць уніз, прытрымліваючы вялікім пальцам левай рукі (мал. 64, *а*). Затым увесці іголку зверху ўніз побач з замацаваннем ніткі (*2*) і вывесці яе на добры бок (*3*). Адлегласць паміж пунктамі *2* і *3* залежыць ад велічыні пятлі. Замацоўваюць пятлю на тканіне шыўком любой даўжыні (гл. мал. 64, *а*). Можна зрабіць фігурную



Правообладатель Адукацыя і выхаванне




Мал. 64. Шво «пятля ўпрымацоўку»: *а* — паслядоўнасць выканання; *б* — складаная пятля; *в* — узоры

пятлю (мал. 64, *б*). Можна замацаваць пятлю кароткім або доўгім шыўком, унутры вялікіх петляў зрабіць меншыя петлі, надаць пятлі рознае становішча.

Калі кветку вышываюць швом «пятля ўпрымацоўку», то сцяблінка выконваецца сцяблістым швом, ліст можа быць цалкам або часткова вышыты гладдзю.

Вышыванне гладдзю таксама належыць да вольных швоў, але гаворка пра гэта пойдзе ў сёмым класе.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Якімі шыўкамі выконваецца шво «набор»?
2. З якіх элементаў складаюцца ўзоры шва «набор»?
3. На якіх тканінах выконваецца лічыльная гладзь?
4. Назаві віды лічыльнай гладзі ў залежнасці ад становішча шыўкоў.
5. Назаві віды вольных швоў.

**лічыльныя швы: «набор», лічыльная гладзь;**
**вольныя швы: «ланцужок»,**
**«пятля ўпрымацоўку»**

ПР Выкананне вышыўкі лічыльнай гладдзю па ўзорах (мал. 65).

ПР Выкананне вышыўкі з выкарыстаннем розных швоў (на выбар; гл. форзац 2).



Мал. 65. Узоры лічыльнай гладзі



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# 7 КЛАС

## ВЫШЫВАННЕ ГЛАДДЗЮ

### § 28. Віды гладзі

**Гладзь** — гэта вышыванне прамымі або косымі шыўкамі, якія запаўняюць плошчу малюнка часткова або цалкам. Гладзь бывае вольная і лічыльная, аднабаковая і двухбаковая, плоскасная (без насцілу) і выпуклая (з насцілам). Вышыўка гладдзю можа быць аднаколернай (белай або ў колер тканіны) і шматколернай. Аднаколернай гладдзю аздабляюць бялізну, блузкі, сурвэткі і абрусы. Шматколернай гладдзю ўпрыгожваюць вырабы хатняга ўжытку — абрусы, канапавыя падушкі, а таксама малюнкі, набліжаныя па форме і колеры да натуральных прадметаў.

Існуе шмат тэхнік выканання гладзі. Вольная без насцілу двухбаковая гладзь шырока выкарыстоўваецца ў раслінных арнаментах і вышываецца каляровымі ніткамі. Дробныя лісцікі выконваюцца косай гладдзю (мал. 66, *а*), плады і ягады — прамой (мал. 66, *б*). У буйных дэталях шыўкі размяшчаюцца па форме ўзору — ад краю да сярэдзіны, у напрамку



Правообладатель Адукацыя і выхаванне




Мал. 66. Гладзь вольная без насцілу

прожылкаў (мал. 66, *в*). Часам контур ллісцікаў зашываюць не цалкам (мал. 66, *г*).

Вышываць гладдзю трэба вельмі акуратна. Выбіраць даўжыню шыўка так, каб вышыўка была прыгожай і практычнай. Напрамак шыўкоў будзе залежаць ад віду гладзі, становішча розных дэталяў малюнка, напрамкаў прыродных ліній прадмета, які вышываюць. Якасць выкананай працы вызначаюць і правільна падабраныя ніткі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Гладзевы валік** — адзін з асноўных элементаў пры выкананні многіх відаў гладзі. Ён выкарыстоўваецца для вышывання тонкіх ліній малюнка і апрацоўкі краёў вырабаў (мал. 67).



Мал. 67. Вузкі гладзевы валік

Гладзевы валік выконваецца ў два прыёмы:

1) выкананне шва «ўперад іголку» па лініі гладзевага валіка;

2) выкананне дробных і частых вертыкальных або косых шыўкоў аднолькавай даўжыні ў напрамку злева направа.

***Парада.*** Каб гладзевы валік быў больш роўным, можна выконваць яго з другой дапаможнай іголкай. Кладуць гэтую іголку ўздоўж шва «ўперад іголку» і абшываюць дробнымі частымі шыўкамі. Пасля выканання вышыўкі на невялікім участку іголку прасоўваюць далей. Па заканчэнні працы іголку выцягваюць са шва.

**Двухбаковая плоскасная гладзь** — гэта вышыўка, якая мае аднолькавы выгляд з добрага і вываратнага бакоў. Шыўкі ў такой гладзі кладуцца вельмі шчыльна, не пакідаючы прарэхаў на тканіне. Двухбаковую гладзь можна выканаць некалькімі радамі гладзевых валікаў з велічынёй шыўка не больш за 0,5—0,7 мм (мал. 68, *а*). Можна вышываць і рознымі па даўжыні шыўкамі, якія ўліваюцца адзін у адзін (мал. 68, *б*).



Правообладатель Адукацыя і выхаванне




Мал. 68. Двухбаковая плоскасная гладзь

**Аднабаковая гладзь — «верхашво»** — шыецца вялікімі шыўкамі, якія ідуць ад цэнтра да краю або ад краю контуру да цэнтра (мал. 69). Іголку ўводзяць







Мал. 69. Аднабаковая гладзь «верхашво»:
*а, б, в* — варыянты шва
(добры і вываратны бакі)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

з добрага боку, захапіўшы па 1—2 ніткі па верхнім і ніжнім контурах малюнка. Нахіл шыўкоў такі ж, як і пры выкананні двухбаковай гладзі. Шчыльны насціл шыўкоў запаўняе малюнак толькі на адным баку вырабу. На вываратным баку рад дробных шыўкоў утварае пункцірную лінію па контуры дэталі (гл. мал. 69).

Гладдзю «верхашво» вышываюць буйныя дэталі малюнка, а таксама галінкі, сцяблінкі і інш. Шыўкі лепш размяшчаць па форме дэталі, якая вышываецца: у кветках — ад краю да цэнтра (мал. 70, *а*), у лісціках і сцяблінках — таксама ад краю да сярэдзіны, але з нахілам. Даўжыня шыўкоў можа быць рознай. Гэта робіць контур дэталі зубчастым.

### *Паслядоўнасць выканання аднабаковай гладзі (верхашво)*

1. Замацаваць рабочую нітку на адным баку, у ніжняй частцы контуру малюнка.




Мал. 70. Верхашво (сцяблінкі)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

2. Выканаць невялікі шывок на верхняй лініі контуру і зацягнуць нітку да ўтварэння гладзевага шыўка.

3. Такім жа спосабам выканаць шывок на ніжняй лініі контуру малюнка.

4. Паўтарыць пункты 2—3, запоўніць усю плошчу дэталі, якая вышываецца.

Шыўкі размяшчаць на невялікай адлегласці адзін ад аднаго.

?

1. Якімі шыўкамі выконваецца гладзь?
2. Назаві розныя тэхнікі выканання гладзі.
3. Як выглядае з добрага і вываратнага бакоў двухбаковая гладзь?
4. Чым адрозніваецца аднабаковая гладзь ад двухбаковай?
5. Назаві адрозненне выпуклай гладзі ад плоскаснай.

**гладзь, гладзевы валік, двухбаковая плоскасная гладзь, аднабаковая гладзь «верхашво»**

П

1. Вызначы на ўзорах розныя віды гладзі.
2. Выканай гладзевы валік рознымі прыёмамі.

## § 29. Гладзь з насцілам. Тэхніка белай гладзі

**Гладзь з насцілам** — гэта двухбаковая гладзь, якая выконваецца па папярэдне пракладзеным насціле (мал. 71).



Правообладатель Адукацыя і выхаванне




Мал. 71. Гладзь з насцілам

Для насцілу выкарыстоўваюцца больш тоўстыя ніткі, чым тыя, якімі выконваецца вышыўка, каб гладзь была выпуклай. У некаторых выпадках бяруць аднолькавыя ніткі (напрыклад, у белай гладзі).

*Паслядоўнасць выканання гладзі з насцілам*

1. Пазначыць контур малюнка швом «уперад іголку» (мал. 71, *а*).

2. Выканаць насціл у адзін або два пласты (мал. 71, *б*).

3. Выканаць асноўную вышыўку двухбаковымі гладзевымі шыўкамі ў напрамку, процілеглым насцілу (мал. 71, *в*).

Адной з разнавіднасцей гладзі з насцілам з'яўляецца **белая гладзь.** Раней такой гладдзю (без насцілу) вышывалі белымі ніткамі па белым ільняным палатне



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

пасцельную і сталовую бялізну. Цяпер гэты від гладзі выкарыстоўваюць у асноўным для аздаблення блузак, каўнерыкаў, насовак, сурвэтак і іншых дробных вырабаў. Гэтую тэхніку пачалі называць «белая гладзь». Выконваецца яна ніткамі таго ж колеру, што і тканіна.

Белая гладзь — гэта двухбаковая гладзь, выконваецца шыўкамі, якія шчыльна прылягаюць адзін да аднаго. Шыўкі кладуцца па ўсёй плошчы дэталі. Добры і вываратны бакі выглядаюць аднолькава. Каб вышытыя дэталі былі больш выпуклымі, неабходна пракласці насціл. Для насцілу выкарыстоўваюць тыя ж ніткі, што і для асноўнай вышыўкі. Выконваць белую гладзь лепш за ўсё мулінэ ў 1—2 ніткі.

*Паслядоўнасць вышывання белай гладдзю*

1. На тканіну перавесці малюнак.
2. Абшыць яго контуры шыўкамі «ўперад іголку».
3. Пракласці насціл.
4. Вышываць у напрамку, процілеглым насцілу.

Для працы неабходныя мяккія і бліскучыя ніткі — мулінэ або шоўк.

Асноўныя дэталі белай гладзі — кружочкі («пышачкі»), лісцікі, кветачкі, вузельчыкі і г. д. Тэхніка выканання гэтых дэталяў апісана ў інструкцыйнай карце.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Інструкцыйная карта**

| № п/п | Малюнак | Дэталь белай гладзі | Паслядоўнасць выканання працы |
|---|---|---|---|
| 1 |  | Кружочкі «пышачкі» | Пракласці контур кружочка швом «уперад іголку» (*а*)<br>Выканаць насціл (*б*)<br>Пачаць вышываць гладзевымі шыўкамі ад сярэдзіны кружочка спачатку направа, затым налева (*в*) |
| 2 |  | Лісцікі | Пракласці контур малюнка<br>Выканаць насціл<br>У дробных лісціках гладзевыя шыўкі размяшчаць як прама (*а*), так і па дыяганалі (*б*) |

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

| № п/п | Малюнак | Дэталь белай гладзі | Паслядоўнасць выканання працы |
|---|---|---|---|
| 3 |   | Лісцікі ўраскол | Больш буйны ліст падзяліць на дзве часткі і вышываць прамымі шыўкамі |
| 4 |  | Кветкі (1-ы спосаб) | *Уся кветка — адна дэталь*<br>Пракласці контур малюнка швом «уперад іголку»<br>Выканаць насціл, размясціўшы шыўкі па крузе і ўздоўж контуру кветкі<br>Запоўніць плошчу кветкі шыўкамі гладзі ад сярэдзіны да бакоў |



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

| № п/п | Малюнак | Дэталь белай гладзі | Паслядоўнасць выканання працы |
|---|---|---|---|
| 5 |  | Кветкі<br>(2-і спосаб) | *Кветка складаецца з асобных пялёсткаў*<br>Абшыць усе пялёсткі па контуры дробнымі шыўкамі швом «уперад іголку»<br>Выканаць насціл, размяшчаючы шыўкі ўздоўж пялёсткаў<br>Запоўніць кожны пялёстак шыўкамі гладзі, размясціўшы іх упоперак дэталі |

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Якія ніткі выкарыстоўваюцца для насцілу?
2. У якім напрамку выконваецца вышыўка па насціле?
3. Дзе выкарыстоўваецца белая гладзь?
4. Назаві дэталі белай гладзі.
5. У якой паслядоўнасці выконваецца белая гладзь?

**гладзь з насцілам, белая гладзь**

ПР Выкананне дэталяў белай гладзі па інструкцыйнай карце.

## § 30. Лічыльная гладзь

**Лічыльная гладзь** вышываецца на аснове падліку нітак тканіны. Гэтым яна адрозніваецца ад іншых відаў гладзі, якія выконваюцца па пераведзеным на тканіну малюнку. Шыўкі трэба накладваць адзін побач з адным, шчыльна і раўнамерна. Паміж шыўкамі не павінна заставацца больш за дзве ніткі тканіны.

Для вышывання лічыльнай гладдзю патрэбна тканіна з раўнамерным перапляценнем нітак. Таўшчыня нітак для вышывання залежыць ад таўшчыні тканіны. Чым таўсцейшыя ніткі, тым менш будзе прасвечваць тканіна паміж шыўкамі. У асноўным для вышывання лічыльнай гладдзю выкарыстоўваюць ніткі ірыс, мулінэ або шарсцяныя.

Шыўкі лічыльнай гладзі можна накладваць у розных напрамках: паралельна ніткам асновы,



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

утку або пад вуглом. Для фарміравання розных узораў (зубчыкаў, «лесвічак» і інш.) трэба чаргаваць вышыню шыўкоў. Іншыя малюнкі (крыж, зорачкі) утвараюцца ў выніку спалучэнняў гарызантальных і вертыкальных шыўкоў.



Мал. 72. Матывы лічыльнай гладзі

Лічыльная гладзь вышываецца ў напрамку злева направа. Пры выкананні зорачак або кветак шыўкі кладуцца па руху гадзіннікавай стрэлкі. Лічыльная гладзь можа дапаўняцца крыжамі, зігзагам, аксамітным швом або якімі-небудзь дадатковымі элементамі. Гэта дазваляе ствараць незлічонае мноства матываў і малюнкаў (мал. 72).

1. Чым лічыльная гладзь адрозніваецца ад іншых відаў гладзі?
2. У якім напрамку кладуцца шыўкі лічыльнай гладзі?
3. Якая тканіна выкарыстоўваецца для вышыўкі лічыльнай гладдзю?

**лічыльная гладзь**



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ПР Выкананне прамых зубчыкаў (мал. 73).

Ход працы

1. Выканай першыя 4 шыўкі даўжынёй у 4 ніткі тканіны.

2. Наступныя 4 шыўкі выканай даўжынёй у 8 нітак тканіны.

3. Зноў выканай 4 шыўкі даўжынёй у 4 ніткі. У выніку ўтворыцца першы зубчык.

4. Такім жа спосабам выконвай зубчыкі да канца рада, чаргуючы даўжыню шыўкоў.

ПР Выкананне зубчыкаў (мал. 74).

Ход працы

1. Выканай першы шывок даўжынёй у 4 ніткі тканіны.

2. Выканай другі шывок даўжынёй у 5 нітак тканіны. Выканай яшчэ 4 шыўкі, павялічваючы кожны на адну нітку.



Мал. 73. Прамыя зубчыкі



Мал. 74. Зубчыкі



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

3. Пачынаючы з сёмага шыўка, укарочвай кожны на адну нітку. Закончы шыўком у 4 ніткі.

4. Па гэтай схеме выконвай зубчыкі да канца рада.

**ПР** Выкананне зубчыкаў у абодва бакі (мал. 75).

Ход працы

1. Выканай першы шывок даўжынёй у 8 нітак.

2. Кожны наступны шывок (да сёмага) выконвай на адну нітку вышэй, не змяняй даўжыню шыўка — у 8 нітак.

3. Пачынаючы з восьмага, кожны наступны шывок выконвай на адну нітку ніжэй, пакуль не дасягнецца ўзровень першага шыўка.

4. Такім чынам чаргуй месца пачатку шыўкоў і вышывай да канца рада. У выніку павінна атрымацца зігзагападобная лінія.



Мал. 75. Зубчыкі ў абодва бакі

**ПР** Выкананне вышыўкі з элементаў лічыльнай гладзі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## § 31. Дэкаратыўная гладзь

Тэхнікі **дэкаратыўнай** гладзі разнастайныя: штрыхавая, ценявая, кітайская, венгерская. Найбольш простыя з іх — штрыхавая і ценявая гладзь.



Мал. 76. Штрыхавая гладзь

Пры вышыванні **штрыхавой гладдзю** (мал. 76) малюнак ствараецца шыўкамі — штрыхамі. Вышыўка не мае выразнага контурнага краю. На розных участках малюнка шчыльнасць шыўкоў можа быць рознай: шыўкі могуць быць як зусім рэдкімі, так і больш шчыльнымі. Гэта выкарыстоўваюць для выдзялення асобных элементаў або часткі малюнка. Частыя шыўкі ствараюць больш яркія ўчасткі, а рэдкія — больш бляклыя.

Пры вышыванні штрыхавой гладдзю пераходы ад аднаго шыўка да другога ажыццяўляюцца за кошт іх нахілу на вываратным баку.

Штрыхавая гладзь можа быць аднаколернай і шматколернай. Калі вышыўка выконваецца адным колерам нітак, яна можа быць як кантраснай, так і ў тон тканіны. Для шматколернай вышыўкі лепш падбіраць ніткі мяккіх тонаў. Штрыхавой гладдзю ўпрыгожваюць прадметы побыту (ручнікі, сурвэткі), дзіцячае адзенне, блузкі, шалікі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

### *Паслядоўнасць выканання штрыхавой гладзі*

1. Прашыць контур малюнка адзін раз дробным радком (шво «ўперад іголку»).

2. Выканаць шыўкі гладзі рознай даўжыні. Адзін канец шыўка размясціць на лініі контуру малюнка. Другі канец накіраваць унутр дэталі. Пры гэтым напрамак шыўкоў павінен супадаць з прыроднымі лініямі аб'екта, які вышываецца.

**Ценявая гладзь** (мал. 77) выконваецца па малюнку з вольным контурам ніткамі розных колераў. Паміж колерамі не павінна быць выразнага кантрасту. Пераход ад аднаго тону нітак да іншага забяспечваецца рознай даўжынёй шыўкоў. Шыўкі плаўна ўліваюцца адзін у аднаго. Такі прыём называецца **ценявым эфектам.**

?

1. Назаві асаблівасці вышыўкі штрыхавой гладдзю.
2. За кошт чаго ажыццяўляецца пераход ад аднаго шыўка да іншага?
3. Раскажы пра паслядоўнасць выканання штрыхавой гладзі.
4. Назаві асаблівасці вышыўкі ценявой гладдзю.

**гладзь: дэкаратыўная, штрыхавая, ценявая**

ПР Выкананне ценявой гладзі на ўзоры.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

### Ход працы

1. Перавядзі малюнак на тканіну.

2. Падбяры ніткі трох тонаў (фіялетавыя, бэзавыя, ружовыя).

3. Умоўна падзялі малюнак па тонах нітак. Потым правядзі алоўкам выгнутыя лініі, якія абазначаюць мяжу пераходу аднаго тону ў іншы.

4. Ружовымі ніткамі вышывай адну частку малюнка (мал. 77, *а*). Шыўкі кладзі шчыльна адзін да аднаго. Іголку ўколвай вышэй або ніжэй за лінію мяжы паміж тонамі. Напрамак шыўкоў павінен супадаць з прыроднымі лініямі аб’екта, які вышываецца.

5. Запоўні другую частку малюнка бэзавымі ніткамі. Выконвай шыўкі рознай даўжыні, размяшчаючы іх паміж шыўкамі ружовага колеру (мал. 77, *б*).

6. Астатнюю частку малюнка вышывай фіялетавымі ніткамі, плаўна ўліваючы адзін тон у іншы (мал. 77, *в*).




Мал. 77. Ценявая гладзь



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

*Патрабаванні да якасці выканання ценявой гладзі:*

- шыўкі не зацягнутыя;
- шыўкі шчыльна прылягаюць адзін да аднаго, не ўтвараюцца прарэхі тканіны;
- шыўкі рознага колеру плаўна пераходзяць адзін у адзін;
- шыўкі не выходзяць за контур малюнка.

ПР Камбінаванне гладзі з іншымі швамі (малюнкі і матывы на выбар).

## ВЫШЫВАННЕ ПАЎКРЫЖОМ І КРЫЖОМ

### § 32. Шво «паўкрыж» і яго варыянты

Тэхніка вышывання паўкрыжом і крыжом — самая распаўсюджаная ў народнай творчасці. Вышываць гэтымі швамі можна па ліку нітак на тканіне палатнянага перапляцення, па канве і па контурах, пазначаных кропкамі. У час працы неабходна сачыць за падлікам нітак тканіны і аднолькавымі напрамкамі верхніх шыўкоў. Чым меншы памер крыжа, тым больш вытанчанай будзе вышыўка. Чым шчыльнейшая і таўсцейшая тканіна, тым буйнейшы памер крыжа.

**Паўкрыж**, або роспіс, — двухбаковае шво, якое складаецца з тонкіх ліній (мал. 78). Гэтыя лініі



Правообладатель Адукацыя і выхаванне




Мал. 78. Шво «паўкрыж» і яго варыянты

ўтвараюцца раўнамернымі прамымі (гарызантальнымі і вертыкальнымі) і косымі (дыяганальнымі) шыўкамі. Шво «паўкрыж» прымяняецца як самастойнае, так і ў спалучэнні з іншымі швамі. Выконваецца яно ў два прыёмы. Спачатку злева направа шыюць рад пракладачных шыўкоў. Адзін шывок кладзецца з добрага боку, другі — з вываратнага.

Пасля таго як рад пройдзены цалкам, рабочай ніткай у зваротным напрамку (справа налева)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

запаўняюцца прамежкі паміж шыўкамі. З вываратнага боку шыўкі пазначаны пункцірам.

У народных вышыўках паўкрыж выкарыстоўваецца і як самастойны, і як дадатковы ў спалучэнні з іншымі швамі.

Разнавіднасцямі паўкрыжа з'яўляюцца **ступеньчатыя шыўкі, лускавінка, клетка, шашачкі, кусцікі** (мал. 79, *а—г*).




Мал. 79. Разнавіднасці шва «паўкрыж»: *а* — лускавінка; *б* — клетка; *в* — шашачкі; *г* — кусцікі; *д* — шво «роспіс»



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

На аснове шва «роспіс» можна стварыць шмат дэкаратыўных узораў, выкананых адным ці некалькімі колерамі нітак (мал. 79, *д*). Паўкрыжом вышываюць абламоўку асобных матываў узору, выкананага іншымі швамі: крыжом, гладдзю і інш.

1. Як утвараецца шво «паўкрыж»?
2. На якіх тканінах выконваецца шво «паўкрыж»?
3. Назаві разнавіднасці шва «паўкрыж».

**швы: «паўкрыж», ступеньчатыя шыўкі, лускавінка, клетка, шашачкі, кусцікі, «роспіс»**

П Выканай на ўзорах шво «паўкрыж» і яго варыянты.

## § 33. Вышыванне крыжом

**Крыж** — самы распаўсюджаны від вышыўкі. Узоры крыжом аздабляюць прадметы побыту і дэталі адзення. Крыжы добра вышываць на разрэджаным палатне раўнамернага перапляцення, на якім лёгка адлічваць ніткі. Часцей за ўсё крыжом вышываюць па канве. Малюнак на палатно не пераводзіцца. Яго вышываюць, гледзячы на ўзор або гатовую вышыўку (мал. 80).

Вышыўка крыжом — адзін з відаў лічыльных швоў, у якіх за аснову ўзяты адлік нітак на тканіне.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 80. Вышыўка крыжом

Гэтая вышыўка нярэдка паўтарае малюнкі, выканаными роспісам. Каб пры вышыванні крыжом выраб атрымаўся прыгожым і акуратным, трэба **прытрымлівацца пэўных правіл.**

1. Вельмі дакладна падлічваць ніткі на тканіне. Памылка нават на адну нітку зблытае ўзор.

2. Пры вышыванні іголку трымаць гарызантальна і шыўкі пракладаць справа налева.

3. Не варта браць занадта доўгую нітку — яна часта блытаецца.

4. Шыўкі на вываратным баку павінны быць кароткімі. Дапускаюцца працяжкі нітак не больш за 1 см. Пры неабходнасці нітка перакручваецца з суседнімі шыўкамі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

*Патрабаванні да якасці вышыўкі крыжом:*

- усе крыжы аднаго памеру;
- вяршыні суседніх крыжоў супадаюць;
- усе верхнія шыўкі ляжаць у адным напрамку;
- на добрым баку скрыжаваныя шыўкі нахільныя, а на вываратным — або гарызантальныя, або вертыкальныя, але абавязкова ляжаць у адным напрамку.

**Крыж косы** аднабаковы складаецца з двух нахільных скрыжаваных шыўкоў. Ніжні шывок накіраваны з левага ніжняга вугла ў правы верхні, а верхні шывок — з левага верхняга вугла ў правы ніжні.

У старадаўніх народных вышыўках шыўкі выконваліся ў гарызантальным, вертыкальным і дыяганальным напрамках у два хады (мал. 81), а ў сучасных вышыўках — у адзін ход (мал. 82).




Мал. 81. Крыж косы аднабаковы ў два хады

1. Якія тканіны выкарыстоўваюцца для вышыўкі крыжом?
2. Да якіх швоў належыць вышыўка крыжом?
3. Якія патрабаванні прад'яўляюцца да вышыўкі крыжом?
4. Назаві прыёмы вышывання крыжом.
5. Разгледзь узоры работ. Вызначы, якія патрабаванні парушаны пры выкананні вышыўкі на добрым баку, на вываратным.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне




Мал. 82. Крыж косы аднабаковы ў адзін ход

Выканай на ўзорах гарызантальныя рады:
- крыж косы аднабаковы ў два хады (мал. 81) у адзін рад, у два рады;
- крыж косы аднабаковы ў адзін ход (мал. 82), шчыльна, блізка адзін да аднаго, з інтэрвалам, па чарзе ў два рады.

Выканай на ўзорах вертыкальныя рады крыжоў па інструкцыйнай карце.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Інструкцыйная карта**

| №<br>п/п | Рад крыжоў. Малюнак | Паслядоўнасць выканання працы |
|---|---|---|
| 1 | Адзіночны вертыкальны рад крыжоў<br> | Спачатку выканаць рад ніжніх шыўкоў крыжоў знізу ўверх, затым перакрыць іх верхнімі шыўкамі ў напрамку зверху ўніз |
| 2 | Прамавугольнік, які складаецца з некалькіх вертыкальных радоў крыжоў<br> | Нітка рухаецца «змейкай» у два праходы «туды-назад». Пры гэтым выкананне вертыкальных радоў — як у пункце 1 |



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

*Заканчэнне*

| № п/п | Рад крыжоў. Малюнак | Паслядоўнасць выканання працы |
| --- | --- | --- |
| 3 | Вертыкальны рад крыжоў з пераходам на суседні рад ніжэй за ўзровень верхняга крыжа  | |
| 4 | Вертыкальны рад крыжоў з пераходам на суседні рад вышэй за ўзровень верхняга крыжа   | |

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## § 34. Прыёмы вышывання крыжом нахільных радоў

Нахільныя рады, як і вертыкальныя, заўсёды выконваюцца ў два праходы ніткі з вяртаннем у пачатковы пункт.

**У адзіночным прамым нахільным радзе з нахілам направа** (мал. 83) палова крыжоў выконваецца ў звычайным парадку (спачатку ніжні, затым верхні), а другая палова — у зваротным парадку (спачатку верхні, затым ніжні).

У першы праход ніткі выконваецца па адным шыўку кожнага крыжа: ніжні — верхні — ніжні — верхні і г. д.

Пры другім праходзе (на зваротным шляху) дапаўняюць шыўкамі няпоўныя крыжы: то перакрываючы ніжні шывок верхнім, то працягваючы ніжні шывок пад верхнім. Такім жа спосабам выконваюць рад з нахілам налева.



Мал. 83. Адзіночны прамы нахільны рад з нахілам направа



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Адзіночны ламаны нахільны рад** можа складацца з няцотнай або цотнай колькасці крыжоў у радзе.

Калі першы ўчастак нахільнага рада складаецца з *няцотнай колькасці* крыжоў (мал. 84, *а*), у першы праход ніткі выконваецца па адным шыўку кожнага крыжа. На вяршыні пачатак выканання нахільнага рада налева трапляе на ніжні шывок. Першы крыж выконваецца цалкам (ніжні шывок, затым верхні).

Пасля гэтага трэба перайсці на другі ўчастак нахільнага рада і выканаць усе крыжы цалкам

*а*



*б*



Мал. 84. Адзіночны ламаны нахільны рад



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

туды-назад. На зваротным шляху трэба абысці ўжо выкананы верхні крыж і дапоўніць усе няпоўныя крыжы нахільнага рада направа.

Калі першы ўчастак складаецца з *цотнай колькасці* крыжоў (мал. 84, *б*), то ў першы праход ніткі таксама пракладаецца па адным шыўку кожнага крыжа. Але на вяршыні пачатак выканання нахільнага рада налева трапляе на *верхні* шывок. Верхні крыж лепш прапусціць.

Спачатку прашываецца другі ўчастак нахільнага рада. На зваротным шляху выконваецца цалкам верхні крыж. Затым дапаўняюцца няпоўныя крыжы першага ўчастка.

**У адзіночным ламаным нахільным радзе, абмежаваным рамкай**, на прамым участку рамкі таксама колькасць крыжоў можа быць няцотнай або цотнай.

Калі на прамым участку рамкі колькасць крыжоў *няцотная* (мал. 85, *а*), то пры першым праходзе верхні крыж выконваецца цалкам, а ніжні прапускаецца. На зваротным шляху дапаўняюцца няпоўныя крыжы.

Калі на прамым участку рамкі колькасць крыжоў *цотная* (мал. 85, *б*), то пры першым праходзе верхні крыж прапускаецца, а ніжні выконваецца цалкам. На зваротным шляху дапаўняюцца няпоўныя крыжы.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 85. Адзіночны ламаны нахільны рад, абмежаваны рамкай

**У скрыжаваным адзіночным нахільным радзе** пачатак выканання цэнтральнага крыжа трапляе на ніжні шывок. Парадак выканання паказаны на малюнку 86.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 86. Скрыжаваны адзіночны нахільны рад

***Парада.*** Пры выкананні любога элемента трэба правільна вызначыць пункт пачатку працы і найбольш трапны шлях праходу ніткі, каб на вываратным баку было як мага менш падоўжных працяжак ніткі і як мага менш крыжоў, выкананых у зваротным парадку.

1. Назаві правілы выканання нахільных радоў.
2. Якое патрабаванне да вываратнага боку пры выкананні нахільных радоў?

Выканай нахільныя рады з цотнай і няцотнай колькасцю крыжоў на ўзорах.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## § 35. Выкарыстанне вышыўкі крыжом для аздаблення бытавых вырабаў

Вышыўка крыжом шырока выкарыстоўваецца для аздаблення ражкоў бытавых вырабаў. На пано або навалачках для канапавых падушак вышыўка можа займаць усю тканіну.

ПР Выраб сурвэткі (мал. 87).
Памер 35 × 35 см + 2 см махры.

Для працы спатрэбяцца: белая льняная канва са шчыльнасцю перапляцення 40 клетак на 10 см, ніткі мулінэ.

Тэхніка выканання: вышыўка крыжом паводле ўзору.



Мал. 87. Сурвэтка



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

### Ход працы

1. Выцягні ніткі тканіны на адлегласці 2 см ад зрэзаў, зрабі махры шырынёй 2 см.

2. Складзі тканіну напалову па нітках асновы, а потым па нітках утку для вызначэння цэнтра работы.

3. Падбяры ніткі патрэбных колераў.

4. Малюнак размясці па цэнтры канвы. Пачынай працу ад цэнтра ўверх, затым уніз.

5. Выконвай вышыўку мулінэ ў 4 ніткі: адзін крыж у адной клетцы тканіны.

6. Гатовую вышыўку адпрасуй па вываратным баку на мяккай падсцілцы.

ПР Ручнік з вышыўкай «Канюшына» (мал. 88).



Умоўныя абазначэнні: ◆◆ — зялёны, ◇◇ — ярка-зялёны, ↑ — цёмна-зялёны, + — светла-зялёны, ○ — чырвоны, ▬ — каралавы, ☒ — аранжавы.

Мал. 88. Схема матыву «Канюшына»



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Для працы спатрэбяцца: тканіна для лічыльнай вышыўкі або канва, ніткі мулінэ для вышывання зялёнага, ярка-зялёнага, цёмна-зялёнага, светла-зялёнага, чырвонага, каралавага, аранжавага колераў.

Тэхніка выканання: вышыўка крыжом па лічыльнай схеме.

Ход працы

1. Вывучы ўмоўныя абазначэнні адценняў колераў.

2. Разгледзь элементы матыву, падбяры ніткі, неабходныя па колеры.

3. Складзі тканіну па асноўнай нітцы і вызначы цэнтр работы. Пракладзі кантрольную лінію.

4. Размясці па цэнтры матыў кветкі, выканай вышыўку спачатку па цэнтры, затым справа і злева — пажаданую колькасць разоў. Нітка ў 3 складанні на адну клетку тканіны.

5. Гатовую вышыўку злёгку адпар з вываратнага боку.

*Патрабаванні да якасці выкананай працы:*

- усе крыжы аднаго памеру;
- вяршыні суседніх крыжоў супадаюць;
- усе верхнія шыўкі ляжаць у адным напрамку;
- на вываратным баку шыўкі або гарызантальныя, або вертыкальныя, але абавязкова ляжаць у адным напрамку;
- шыўкі на вываратным баку кароткія.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# РАМОНТ АБУТКУ

# 6 КЛАС

## § 36. Абсталяванне і арганізацыя майстэрні па рамонце абутку

У школьнай майстэрні ты будзеш выконваць самыя простыя работы па рамонце абутку. Таму і абсталяванне табе спатрэбіцца самае простае.

Асноўнае працоўнае месца — **стол абутніка** (мал. 89). Яго называюць таксама стол-варштат абутніка.



Мал. 89. Стол абутніка



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У майстэрнях па рамонце абутку выкарыстоўваюцца сталы абутніка, якія выпускаюцца рознымі прадпрыемствамі. Для зручнасці работніка яны могуць аснашчацца скрынкамі для захоўвання інструментаў, паліцамі, латкамі.

Калі рабочая паверхня стальніцы драўляная або з пластыка, да яе можна прымацаваць металічную *пласціну* (мал. 90).



Мал. 90. Стальніца з металічнай пласцінай

Дома пад такое працоўнае месца можна прыстасаваць стары кухонны стол.

У майстэрні ёсць таксама **працоўныя месцы калектыўнага карыстання**, на якіх усталёўваюцца ціскі, прэсы, электрычныя пліты і іншае абсталяванне. Гэтымі працоўнымі месцамі навучэнцы карыстаюцца пры неабходнасці. Праца на іх, як і на індывідуальных працоўных месцах, выконваецца толькі з дазволу настаўніка пасля правядзення неабходнага навучання.

Для захоўвання інструментаў могуць служыць прыстасаваныя для гэтага месцы стала абутніка або іншыя, аднак яны павінны быць пастаяннымі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Чым можа абсталёўвацца стол абутніка?
2. Чым могуць абсталёўвацца працоўныя месцы калектыўнага карыстання?

## § 37. Правілы санітарыі і гігіены, паводзін і бяспекі на занятках па рамонце абутку

Успомні і пералічы агульныя правілы санітарыі і гігіены, паводзін і бяспекі на занятках у майстэрні.

Калі не выконваць гэтыя правілы, то небяспечнай можа быць і любая іншая праца — з малатком, клеем і г. д. Напрыклад, ты будзеш карыстацца клеем, а ён можа выклікаць раздражненне скуры рук і ўяўляць небяспеку для вачэй, валасоў. Таму важна выконваць не толькі правілы бяспечных паводзін і бяспекі працы, але і санітарыі і гігіены (нашэнне працоўнай вопраткі і галаўных убораў, мыццё рук і інш.).

На занятках па рамонце абутку ты будзеш карыстацца нажамі, шыламі і некаторымі іншымі колючымі і рэжучымі інструментамі. Працуючы, іх неабходна трымаць так, каб не нанесці сабе траўмаў і парэзаў.

Як і любыя іншыя, колючыя і рэжучыя інструменты да працы рыхтуюць загадзя, а перад працай правяраюць спраўнасць (вызначаюць, ці добра на іх трымаюцца ручкі, ці не маюць якіх-небудзь дэфектаў) і размяшчаюць на працоўным месцы ручкай да сябе.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Вывучэнню і паўтарэнню правіл санітарыі і гігіены, паводзін і бяспекі на занятках па рамонце абутку трэба ўвесь час надаваць асаблівую ўвагу.

?

1. Успомні, якую небяспеку можа ўяўляць праца малатком. Як засцерагчы сябе ад траўмаў пры карыстанні малатком?
2. Назаві правілы захоўвання і размяшчэння колючых і рэжучых інструментаў на працоўным месцы.

## § 38. Агульныя звесткі пра абутак

Да самых неабходных для чалавека прадметаў належыць абутак. Ён ахоўвае ногі ад холаду, вады, засцерагае ад траўмаў ступню. Абутак мае не толькі практычнае значэнне, але і можа ўпрыгожваць ногі.

Абутак можа быць прызначаны для выкарыстання ў звычайных умовах — для штодзённай носкі **(штодзённы)**, для ўрачыстых выпадкаў **(мадэльны)**, для дому **(хатні)**, для актыўнага адпачынку, для дарогі, для людзей сталага ўзросту. Шырокі ўжытак мае і абутак, які ствараецца з улікам розных умоў — вытворчых **(вытворчы)**, заняткаў рознымі відамі спорту **(спартыўны)** і інш. Яго канструкцыя адпавядае прызначэнню.

У залежнасці ад сезона, для якога абутак прызначаны, ён падзяляецца на зімовы, вяснова-восеньскі,



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

летні і кругласезонны. Абутак адрозніваюць таксама па канструкцыі і знешнім выглядзе (мал. 91).




Мал. 91. Віды абутку: *а* — боты (мужчынскія і жаночыя); *б* — чаравікі; *в* — паўчаравікі; *г* — адкрытыя і закрытыя туфлі; *д* — сандалі

Абутак складаецца з асобных дэталяў. Падэшва і абцас належаць да дэталяў **нізу абутку**, іншыя дэталі — **да верху абутку** (мал. 92).

Для злучэння нізу з верхам абутку выкарыстоўваюцца розныя метады: клеявы, ліццёвы, нітачны і інш. Ты пазнаёмішся з імі, працуючы з розным абуткам.

Любы абутак з часам старэе і зношваецца. Каб ён служыў як мага даўжэй, неабходна правільна захоўваць абутак і выконваць патрабаванні па яго доглядзе.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У вытворчасць абутку ўкладваюць працу многіх людзі. Адной з найбольш распаўсюджаных прафесій абутковай вытворчасці з'яўляецца **зборшчык верху** абутку. Рамонтам займаецца **абутнік па рамонце** абутку. У залежнасці ад сваёй кваліфікацыі ён выконвае дробны, сярэдні ці буйны рамонт абутку. Атрымаць гэтыя прафесіі можна ва ўстановах прафесійна-тэхнічнай адукацыі.




Мал. 92. Вонкавыя дэталі чаравіка:
*а* — падэшва; *б* — абцас; *в* — насок; *г* — саюзка; *д* — задзінка; *е* — берац

1. Які бывае абутак у залежнасці ад умоў яго выкарыстання?
2. Пералічы знаёмыя табе віды абутку (гл. форзац 1).
3. Назаві вонкавыя дэталі абутку, з якімі ты пазнаёміўся.

## § 39. Догляд абутку

Абутак патрабуе пастаяннага правільнага догляду. Пры гэтым трэба ўлічваць матэрыял, з якога абутак выраблены. Прасцей за ўсё даглядаць **гумавы абутак.** Пасля вяртання з вуліцы верх гумавага абутку дастаткова працерці вільготнай анучкай



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

і выцерці насуха, а падэшву пры неабходнасці вымыць. Потым гумавы абутак можна папаліраваць анучкай, змочанай у гліцэрыне або алеі. Некаторыя мадэлі гумавага абутку можна мыць знутры, папярэдне дастаўшы вусцілкі (сцілкі). Вусцілкі ў гумавым, як і ў іншым, абутку трэба перыядычна мыць або замяняць на новыя. Краі падэшвы светлага гумавага абутку добра чысцяцца ласцікам.

**Тэкстыльны абутак** лёгка прамакае. Таму яго рэкамендуецца апрацаваць воданепрымальным сродкам. Перад чысткай верху тэкстыльнага абутку забруджанні з падэшвы можна выдаліць з дапамогай старой зубной шчоткі. Сродкі для чысткі тэкстыльнага абутку трэба выкарыстоўваць паводле рэкамендацый вытворцы, якія ўлічваюць асаблівасці матэрыялу, з якога такі абутак зроблены.

Свае асаблівасці мае і догляд **скуранога** абутку. Вельмі важна ўлічваць матэрыял, з якога ён зроблены. Напрыклад, для чысткі абутку з гладкай скуры і з ворсавай скуры (нубук, велюр, замша) выкарыстоўваюцца розныя сродкі. Для чысткі абутку з ворсавай скуры рэкамендуюцца губкі, спецыяльныя гумкі і шчоткі. Чысцяць гэты абутак толькі ў сухім стане.

Мокры абутак неабходна сушыць пры хатняй тэмпературы. Нельга сушыць абутак каля ацяпляльных прыбораў або на іх, каля агню. Каб абутак не губляў



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

форму, можна напакаваць яго паперай або выкарыстаць спецыяльныя ўстаўкі.

Для працяглага захоўвання абутку трэба падабраць месца, у якое не пранікаюць сонечныя прамяні і вільгаць. Абутак павінен быць чыстым і высушаным. Рэкамендуецца нанесці ахоўныя сродкі (абутковую ваксу ці іншыя), правесці дэзынфекцыю, выветрыць.

?

1. Азнаёмся з інструкцыямі і памяткамі па доглядзе абутку, якія прапануюць розныя вытворцы. Пра што ў іх гаворыцца?
2. Азнаёмся з рознымі інструкцыямі па выкарыстанні абутковай ваксы.
3. Азнаёмся з інструкцыямі па выкарыстанні іншых сродкаў догляду абутку.
4. Для чаго пры сушцы абутку ў яго набіваюць паперу або ўстаўляюць спецыяльныя прыстасаванні?

ПР Мыццё гумавага абутку.

ПР Чыстка сухога тэкстыльнага абутку.

ПР Чыстка сухога скуранога абутку з гладкай скуры.

### Ход працы

1. Падбяры прадметы догляду (шчоткі для чысткі і для нанясення абутковай ваксы, паліровачныя сурвэткі або паліровачныя шчоткі) і абутковую ваксу з улікам колеру абутку.

2. Ачысці абутак.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

3. Раўнамерна нанясі абутковую ваксу на паверхню абутку і дай ёй увабрацца.

4. Папаліруй паверхню абутку.

## § 40. Праца са скурай і скурзамяняльнікамі

Верх абутку вырабляюць з розных відаў натуральных, штучных і сінтэтычных скур, абутковага тэкстылю. **Натуральная скура** выпрацоўваецца са шкур жывёл. **Штучная** і **сінтэтычная скура** — гэта падобныя на скуру матэрыялы; іх атрымліваюць з рэчываў, якія называюцца **палімерамі**.

Адрозніць штучную і сінтэтычную скуру ад натуральнай бывае няпроста, але магчыма. Напрыклад, калі сагнуць насок чаравіка ці націснуць на верх наска пальцам, то на натуральнай скуры ў момант націску ўтвараюцца дробныя зморшчынкі, якія пасля выпроствання чаравіка хутка знікаюць. Можна таксама накласці далонь на 10—15 секунд на матэрыял абутку; натуральная скура нагрэецца, а штучная застанецца халаднаватай.

Дэталі верху абутку змацоўваюцца ніткамі. Ніткі могуць быць баваўняныя, капронавыя, лаўсанавыя і інш. Каб лепш пазнаёміцца з апрацоўкай матэрыялаў для верху абутку, ты зробіш нескладаны выраб — чахол для расчоскі. Для працы з гэтымі матэрыяламі табе спатрэбяцца інструменты, з якімі ты ўжо добра знаёмы, — нажніцы, шыла, іголка.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Успомні і пералічы правілы бяспекі пры карыстанні колючымі і рэжучымі інструментамі.

## Выраб чахла для расчоскі па тэхналагічнай карце.

**Тэхналагічная карта**

| №<br>п/п | Малюнак | Паслядоўнасць выканання працы |
|---|---|---|
| 1 |  | Абвесці на загатоўках выкрайку. Размецiць месцы праколаў |
| 2 |  | Выканаць шылам праколы |



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

| №<br>п/п | Малюнак | Паслядоўнасць выканання працы |
| --- | --- | --- |
| 3 |  | Выкраіць дэталі чахла |
| 4 |  | Сшыць чахол косым абкідальным швом |

## § 41. Вусцілкі. Замена вусцілак

**Вусцілкі (сцілкі)** — гэта ўнутраныя дэталі нізу абутку. Трэба адрозніваць асноўныя, укладныя вусцілкі і паўвусцілкі (мал. 93).



Правообладатель Адукацыя і выхаванне




Мал. 93. Вусцілка (*а*) і паўвусцілка (*б*)

Вусцілкі паглынаюць вільгаць, дапамагаюць падтрымліваць спрыяльную тэмпературу ў абутку, таму яны важныя для забеспячэння гігіены ног. На ноч укладныя вусцілкі рэкамендуецца даставаць і прасушваць. Для вырабу ўкладных вусцілак выкарыстоўваюцца скура, тэкстыльныя матэрыялы, порыстая гума, мех, кардон і інш.

На ўроках працоўнага навучання ты вырабіш мадэль вусцілкі з абутковага кардону. Ён прыдатны як для асноўных, так і для ўкладных вусцілак і паўвусцілак. Таўшчыня кардону можа быць ад 0,9 да 2,5 мм. Рэжучы кардон, трэба захоўваць правілы бяспекі пры карыстанні нажніцамі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Разгледзь малюнак 93. Чым адрозніваюцца вусцілкі ад паўвусцілак?
2. Для чаго патрэбныя вусцілкі?

Падбяры і замяні вусцілкі.

Выраб мадэлі вусцілак з абутковага кардону.

Ход працы

1. Размець загатоўку па шаблоне (лякале).
2. Выкраі вусцілку.

**вусцілкі**



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# 7 КЛАС

## § 42. Ручныя інструменты для рамонту абутку

На занятках па рамонце абутку ты будзеш **выкарыстоўваць:** нажы (*а*), шылы (*б*), рашпілі, напільнікі (*в*), абцугі (*г*), цвікадзёр (*д*), малаток шавецкі (*е*), паліровачныя інструменты (*ж*) (мал. 94).

**Нажы** служаць для раскрою і апрацоўкі матэрыялаў пры пашыве абутку, а таксама паўфабрыкатаў з іх для рамонту самога абутку. **Шылы** неабходныя для выканання праколаў, праз якія дэталі абутку мацуюцца ніткамі. **Рашпілі і напільнікі** патрэбныя для апілоўвання і спілоўкі металічных шпілек і цвікоў. **Абцугамі-вастрагубцамі,** або **кусачкамі,** ты будзеш «адкусваць» верхнюю частку цвікоў. Выцягваць цвікі зручна **звычайнымі абцугамі** і **цвікадзёрам. Малаток шавецкі** спатрэбіцца табе пры зборцы абутку. **Урэзнікі, канцікі, такмачы, адводкі** — гэта паліровачныя інструменты. Яны патрэбны для аздаблення (паліроўкі) вонкавых дэталяў абутку.

Правілы бяспекі пры карыстанні шылам ты вывучаў на занятках па працоўным навучанні ў малодшых класах, а рашпілямі, напільнікамі, абцугамі,



Правообладатель Адукацыя і выхаванне




Мал. 94. Інструменты для рамонту абутку



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

малатком — на занятках па апрацоўцы драўніны і металаў. Успомні гэтыя правілы і строга іх выконвай!

Пры працы нажом пальцы трымай на адлегласці 1—2 см ад ляза. Працаваць нажом трэба «ад сябе». Нажы павінны быць добра завостраныя і не мець шчарбін.

Пры карыстанні цвікадзёрам не нахіляйся над ім. Рухі гэтым інструментам павінны быць нярэзкімі.

Паліровачны інструмент перад працай звычайна награюць. Таму пры карыстанні ім трэба сцерагчыся апёкаў. Не паднось інструмент блізка да рук і іншых частак цела.

?

1. Раскажы пра прымяненне ручных інструментаў для рамонту абутку.
2. Назаві правілы бяспекі пры карыстанні нажамі.
3. Назаві правілы бяспекі пры карыстанні шылам.
4. Назаві правілы бяспекі пры карыстанні рашпілямі і напільнікамі.
5. Назаві правілы бяспекі пры карыстанні абцугамі.
6. Назаві правілы бяспекі пры карыстанні цвікадзёрам.
7. Назаві правілы бяспекі пры карыстанні малатком.
8. Чаго і як трэба сцерагчыся пры карыстанні паліровачнымі інструментамі?

**цвікадзёр, малаток шавецкі, урэзнік, канцік, такмач, адводка**



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## § 43. Абутковыя калодкі

**Абутковымі калодкамі** карыстаюцца пры пашыве абутку для таго, каб надаць ступні форму, пры рамонце і захоўванні абутку ў хатніх умовах — для захавання яго формы, а таксама для расцяжкі новага і ношанага абутку.

Калодкі могуць мець розную канструкцыю. Напрыклад, яны бываюць суцэльнымі (мал. 95, *а*, *б*) або рассоўнымі (мал. 95, *в*). Калодкі адрозніваюцца таксама па памерах, форме і паўнаце. Яны могуць быць зроблены з дрэва або іншых матэрыялаў.




Мал. 95. Абутковыя калодкі

1. Для чаго прымяняюцца абутковыя калодкі?
2. Назаві прыметы, па якіх калодкі адрозніваюцца.

**абутковыя калодкі**

## § 44. Падрыхтоўка абутку да дробнага рамонту

У працэсе нашэння абутак паступова старэе і ў ім з’яўляюцца дэфекты, гэта значыць пашкоджанні.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Можна вылучыць наступныя групы дэфектаў абутку па месцы іх размяшчэння:

- дэфекты верху і падшэўкі абутку і іх змацаванняў;
- дэфекты дэталяў нізу абутку;
- дэфекты змацавання дэталяў нізу абутку.

Да **дэфектаў верху і падшэўкі абутку** і іх змацаванняў адносяцца: зношванне асобных участкаў, разрывы саюзак, дэфармацыя верху абутку з утварэннем на саюзках грубых зморшчын, змяненне колеру з-за забруджвання (асабліва светлага верху, а таксама верху з велюру і замшу), разрыў раменьчыкаў, рамянёў, псаванне засцежак-маланак, парушэнне швоў, абсыпанне пакрыцця на скуры і інш.

**Дэфекты дэталяў нізу абутку** — памяншэнне таўшчыні падэшваў, падноскаў, абцасаў, набоек, пералом падэшваў па лініі выгінання абутку і інш.

**Дэфекты змацавання дэталяў нізу абутку** — гэта часцей за ўсё адклейванне падэшвы ў клеявым абутку, адрыў ранта і адрыў падэшвы ад ранта ў рантавым абутку, адрыў сярэдніх і высокіх абцасаў.

Агляд абутку для выяўлення яго дэфектаў можна правесці ў такім парадку:

- агляд верху і падшэўкі абутку і іх змацавання;
- агляд дэталяў нізу абутку і месцаў іх змацавання.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Для падрыхтоўкі абутку да рамонту табе спатрэбяцца: лапа шавецкая, нож, кусачкі, адвёртка. Лапа шавецкая (стойка-лапа, лапка) будзе неабходная таксама для выканання дробнага рамонту падноскі абутку, убівання цвікоў у набойкі і іншых работ. Лапа шавецкая — зробленае са сталі прыстасаванне, якое мацуецца на стрыжні (мал. 96).



Мал. 96. Лапа шавецкая

Падрыхтоўваючы абутак да рамонту, трэба прытрымлівацца правіл бяспекі пры карыстанні інструментамі, пра якія гаварылася ў папярэдніх параграфах.

1. Пра якія групы дэфектаў абутку ты даведаўся?
2. Знайдзі і пакажы на абутку, які табе прапануе настаўнік, дэфекты верху, падшэўкі і іх змацавання.
3. Знайдзі і пакажы на абутку, які табе прапануе настаўнік, дэфекты дэталяў нізу.
4. Знайдзі і пакажы на абутку, які табе прапануе настаўнік, дэфекты змацавання дэталяў нізу.

**лапа шавецкая**

ПР Падрыхтоўка абутку да дробнага рамонту.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Ход працы

1. Агледзь абутак. З дапамогай настаўніка выяві дэфекты абутку.

2. Ліквідуй забруджванні.

3. Падбяры з дапамогай настаўніка матэрыялы для рамонту.

4. Выдалі металічныя замацавальнікі і зношаныя дэталі.

## § 45. Дробны рамонт падноска абутку (пастаноўка рубцоў)

**Падносак** (рус. подмётка) **абутку** — гэта частка падэшвы да абцаса. Звычайна больш за ўсё зношваецца (сціраецца, патанчаецца) насочная частка падэшвы. Аднак у залежнасці ад асаблівасцей хады і магчымага браку матэрыялу падэшва можа быць моцна зношанай і ў іншых месцах. Своечасовая пастаноўка **рубца** можа прадухіліць далейшае разбурэнне падноска падэшвы і падоўжыць тэрмін службы абутку. Размяшчэнне і форма рубцоў могуць быць рознымі (мал. 97).

Рубцы ставяцца на падэшву, якая выраблена з ліставога матэрыялу. Іх выкройваюць з таго ж матэрыялу, з якога выраблена падэшва. Рубцы можна паставіць клеявым спосабам мацавання. Ён забяспечвае не толькі трываласць, але таксама шчыльнасць



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

месца злучэння і яго непранікальнасць для вады і пылу.

Для рамонту спатрэбіцца калодка, адпаведная абутку, які рамантуецца. Калі патрэбнай калодкі няма, працу можна выканаць і на шавецкай лапе.

*Паслядоўнасць пастаноўкі рубцоў*

1. Вызначыць дэфекты.
2. Падабраць матэрыялы.
3. Падрыхтаваць месца пад рубцы (след абутку).
4. Выкраіць і апрацаваць рубцы.
5. Нанесці і высушыць клеявыя плёнкі; прыклеіць рубцы.
6. Абрэзаць лішкі рубцоў, правесці іх апрацоўку.

Участак падэшвы, які рамантуецца, трэба выраўнаваць, а затым падрапаць рашпілем, каб ён не быў гладкім. Рубец па памеры і форме павінен адпавядаць участку падэшвы,



Мал. 97.
Размяшчэнне
і форма рубцоў



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

якi рамантуецца, з улiкам прыпуску на абразанне i наступную апрацоўку (фрэзераванне, шлiфаванне).

Па лiнii прамога зрэзу рубец з нехадавога боку цалкам спускаецца (зразаецца) на шырыню 10—15 мм. З нехадавога боку ён драпаецца рашпiлем, каб паверхня зрабiлася нягладкай па ўсёй плошчы. Утвораны пыл выдаляецца валасяной шчоткай.

Клей на паверхню рубца i следу абутку наносiцца роўным суцэльным пластом. Не павiнна быць згусткаў i падцёкаў. Можна браць розныя вiды клею ў адпаведнасцi з iнструкцыяй па яго выкарыстаннi. Абавязкова прытрымлiвацца мер бяспекi. Агульныя **меры бяспекi** пры карыстаннi клеем наступныя:

- добра праветрываць памяшканне, у якiм працуеш;
- захоўваць клей i працаваць з iм на значнай адлегласцi ад агню;
- не дапускаць, каб клей трапляў на скуру рук, твар, асаблiва ў вочы;
- калi клей трапiць на скуру, выдалiць яго баваўняным тампонам, затым змыць вадой з мылам;
- калi клей трапiць у вочы, неадкладна змыць значнай колькасцю вады i абавязкова звярнуцца да ўрача.

Часта карыстаюцца **наiрытавым** клеем. На дэталi са скуры i чорнай порыстай гумы, якiя добра ўбiраюць клей, яго наносяць два разы, а з iншых вiдаў гумы — адзiн раз. Пасля першай намазкi



Правообладатель Адукацыя i выхаванне

клеявыя плёнкі сушаць 15—20 хвілін, а пасля другой намазкі — не менш за 40 хвілін. Пасля сушкі клеявых плёнак іх разаграюць, затым прыклейваюць рубец.

Паверхні, якія склейваюцца, трэба прыціснуць на кароткі час. Вельмі важная сіла сціскання.

Прыклееены рубец абразаецца і **фрэзеруецца** па ўсім контуры. Ён павінен дакладна адпавядаць форме следу абутку на гэтым участку.

Пры пастаноўцы рубцоў трэба выконваць правілы бяспекі працы з інструментамі, клеем, а таксама з прыборамі, якія выкарыстоўваюцца для актывацыі, гэта значыць разагравання, клеявых плёнак.

?

1. Раскажы пра паслядоўнасць працы пры пастаноўцы рубцоў.
2. Чаму павінны адпавядаць памер і форма рубца?
3. Раскажы пра нанясенне і сушку клеявых плёнак.

ПР

Пастаноўка рубцоў.

**падносак абутку, рубец**



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# ЗМЕСТ

**Прадмова** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

## ПЛЯЦЕННЕ З ЛАЗОВАГА ДУБЦА

### 6 КЛАС

§ 1. Абсталяванне майстэрні. . . . . . . . . . . . . . . . . . . 5
§ 2. Правілы паводзін, бяспекі, санітарыі і гігіены на занятках па пляценні з лазовага дубца . . . . . . . . . . . . . 8
§ 3. Пляценне з лазовага дубца як народны промысел і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва . . . . . 9
§ 4. Матэрыялазнаўства . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 11
§ 5. Нарыхтоўка лазовых дубцоў. . . . . . . . . . . . 14
§ 6. Сартаванне лазовых дубцоў. . . . . . . . . . . . . 20
§ 7. Інструменты і трэнажоры для пляцення . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 22
§ 8. Падрыхтоўка матэрыялу да пляцення . . . 25
§ 9. Простае пляценне. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 27
§ 10. Вяровачка ў два дубцы . . . . . . . . . . . . . . . . . 30
§ 11. Простая загібка. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 33
§ 12. Выраб кашпо для кветкавага вазона. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 37



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## 7 КЛАС

§ 13. Акаркаванне лазовых дубцоў . . . . . . . . . . . 41
§ 14. Сартаванне і сушка акаркаваных лазовых дубцоў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 44
§ 15. Вяровачка ў тры дубцы . . . . . . . . . . . . . . . . . 46
§ 16. Пляценне вырабаў з гатовым дном . . . . . . 49
§ 17. Выраб сувенірнага кошычка з гатовым донцам і вітай ручкай з двух дубцоў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 54
§ 18. Папластовае пляценне . . . . . . . . . . . . . . . . . 58

## РУЧНАЯ ВЫШЫЎКА

## 6 КЛАС

§ 19. Працоўнае месца вышывальшчыцы . . . . . . 61
§ 20. Вышыўка як від дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 62
§ 21. Матэрыялы, інструменты і прыстасаванні для ручной вышыўкі . . . . 66
§ 22. Правілы бяспекі пры карыстанні інструментамі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 71

**Простыя швы і іх камбінаванне** . . . . . . . . . . . . . . . 73
§ 23. Віды простых швоў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 73



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

§ 24. Падрыхтоўка да вышывання.
Выбар, перавод і змяненне малюнка . . . . . 81
§ 25. Падбор тканіны і нітак для вышывання. . . 87
§ 26. Замацаванне рабочай ніткі . . . . . . . . . . . . . 89
§ 27. Лічыльныя і вольныя швы . . . . . . . . . . . . . 91

## 7 КЛАС

**Вышыванне гладдзю**. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 98
§ 28. Віды гладзі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 98
§ 29. Гладзь з насцілам. Тэхніка белай гладзі . . . 103
§ 30. Лічыльная гладзь . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 109
§ 31. Дэкаратыўная гладзь . . . . . . . . . . . . . . . . 113

**Вышыванне паўкрыжом і крыжом** . . . . . . . . . . 116
§ 32. Шво «паўкрыж» і яго варыянты . . . . . . . 116
§ 33. Вышыванне крыжом . . . . . . . . . . . . . . . . . 119
§ 34. Прыёмы вышывання крыжом
нахільных радоў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 125
§ 35. Выкарыстанне вышыўкі крыжом
для аздаблення бытавых вырабаў. . . . . . . 130



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## РАМОНТ АБУТКУ

### 6 КЛАС

§ 36. Абсталяванне і арганізацыя майстэрні па рамонце абутку . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 133
§ 37. Правілы санітарыі і гігіены, паводзін і бяспекі на занятках па рамонце абутку . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 135
§ 38. Агульныя звесткі пра абутак . . . . . . . . . . 136
§ 39. Догляд абутку . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 138
§ 40. Праца са скурай і скурзамяняльнікамі. . . 141
§ 41. Вусцілкі. Замена вусцілак. . . . . . . . . . . . . 143

### 7 КЛАС

§ 42. Ручныя інструменты для рамонту абутку . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .146
§ 43. Абутковыя калодкі. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .149
§ 44. Падрыхтоўка абутку да дробнага рамонту. . . . . . . . . . . . . . . . . . . .149
§ 45. Дробны рамонт падноска абутку (пастаноўка рубцоў) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .152



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# ІНСТРУМЕНТЫ ПЛЯЦЕЛЬШЧЫКА



Нож-касяк



Шыла



Шчамілкі



Сякатар



Бакарэз



Круглагубцы

# ВЫРАБЫ З ПРОСТЫМ ПЛЯЦЕННЕМ







# ВЫРАБЫ З ПАПЛАСТОВЫМ ПЛЯЦЕННЕМ







Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# ВІДЫ АБУТКУ ПА СЕЗОНАХ

## Вяснова-восеньскі абутак








## Зімовы абутак








## Летні абутак








Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# ВІДЫ ШВОЎ

## Простыя швы



Шво «ўперад іголку»



Сцяблістае шво



Пяцельнае шво



Аксамітнае шво

## Лічыльныя швы



Лічыльная гладзь



Шво «набор»



Шво «крыж косы»

## Вольныя швы



Сцяблістае шво



Тамбурнае шво



Шво «пятля ўпрыма-цоўку»

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# ВЫШЫЎКА
# З ВЫКАРЫСТАННЕМ РОЗНЫХ ШВОЎ



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

(Назва і нумар установы адукацыі)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |

Вучэбнае выданне

**Шынкарэнка** Уладзімір Анатольевіч
**Няпрахіна** Наталля Аляксееўна
**Цярошкіна** Валянціна Тадэвушаўна

# Працоўнае навучанне
# Рамёствы

Вучэбны дапаможнік для 6—7 класаў
першага аддзялення дапаможнай школы
з беларускай мовай навучання

Рэдактары *С. В. Карпілава, Г. І. Кашэўнікава*
Мастак вокладкі *В. К. Жалудкова*
Мастакі *С. М. Прохараў, Н. А. Хромава, К. К. Шастоўскі, Н. А. Юрчанка*
Камп'ютарны набор *А. І. Рамановіч*
Камп'ютарная вёрстка *А. І. Рамановіч*
Карэктар *А. У. Бельская*

Падпісана да друку 22.01.2016. Фармат $70 \times 90\ ^1/_{16}$.
Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 11,7 + 0,29 форзац. Ул.-выд. арк. 6,6 + 0,4 форзац.
Тыраж 769 экз. Заказ

РУП «Выдавецтва “Адукацыя і выхаванне”».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/19 ад 14.11.2014.
Вул. Будзённага, 21, 220070, г. Мінск.

ААТ «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/3 ад 04.10.2013.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, г. Мінск.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне